Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 68 (3972)
СЕРАДА, 11 САКАВІКА
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

# Партыйныя арганізацыі непасрэдна адказваюць

## *за становішча нізавога друку і рабселькораўскага руху!*

Нядаўна праведзенае Менскім гаркомам КП(б)Б масавае абсьледваньне таго, як партыйныя ячэйкі ажыцьцяўляюць кіраўніцтва нізавым друкам, выявіла пэўную РАЗМЫЧКУ, «НОЖНІЦЫ» паміж бурным уздымам, ростам актыўнасьці і самадзейнасьці мас рабкораў-ударнікаў і яўна-нездавальняючаю пастаноўкаю сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва з боку значнай часткі партыйных ячэек Менску.

Сыстэматычнае кіраўніцтва нізавым друкам і рабсельнорамі і да гэтага часу ўсё яшчэ не зьяўляецца сустаўной часткай ПЛЯНАЎ РАБОТ ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК І НАВАТ АСОБНЫХ РАЁННЫХ КАМІТЭТАЎ ПАРТЫІ.

Нядаўна закончыўшая сваю работу ўсесаюзная нарада дала выразныя, бальшавіцкія ўстаноўкі рабселькораўскаму руху ў пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, у пэрыяд завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.

Усесаюзная нарада, на падставе пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) і сьнежаньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) вырашыла асноўныя арганізацыйныя пытаньні і намеціла чарговыя практычныя задачы нізавога друку і работы сярод рабселькораў.

Усесаюзная нарада выразна паказала ролю нізавога друку і рабселькораў у справе ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, у барацьбе на два фронты, супроць усялякіх хістаньняў ад ленінізму.

Нарада абагуліла палітычны і арганізацыйны вопыт, які за апошнія гады накоплены рабселькораўскім рухам і нізавым друкам.

Напружанае сацыялістычнае будаўніцтва, выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, абвостраная клясавая барацьба, шалёнае супраціўленьне адміраючых эксплёататарскіх кляс нашаму разгорнутаму наступленьню, ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі — усё гэта патрабуе яшчэ большай клясавай пільнасьці нашага друку, патрабуе сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў, бальшавіцкіх форм, мэтадаў і зьместу ўсёй работы нашых газэт.

Ударныя брыгады друку, вызныя рэдакцыі, фабрычныя і калгасныя друкаваныя газэты, насьценгазэты ў цэхах, на асобных вытворчых вучастках і нават агрэгатах, газэты ў полі (якія выходзяць у часе сэўбы) — усё гэта ўцягвае да непасрэднай, творчай работы ў друку новыя дзесяткі і сотні тысяч рабочых калгасьнікаў, батракоў, беднякоў і сераднякоў, — усё гэта настойліва патрабуе сыстэматычнага і ўважлівага кіраўніцтва з боку ўсёй партыйнай арганізацыі ў цэлым, кожнай партыйнай ячэйкі ў асобку.

Бурна ўзрастаючая актыўнасьць мас на фронце вялізарнай сацыялістычнай будоўлі (сустрэчны прамфінплян, ударныя брыгады, плянава-апэрацыйныя групы, «сквозные» брыгады, грамадзкі буксір і г. д.) забясьпечвае, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, магутны рост нізавога друку, магутнае разьвіцьцё ўдарнага руху вакол друку, узьнікненьне шматлікіх і рознастайных форм арганізацыйна-масавай і прэпагандысцка-апэрацыйнай работы.

Партыйныя арганізацыі павінны СТАЦЬ НА ЧАЛЕ далейшага росту рабселькораўскай арганізацыі і нізавога друку.

НЕАБХОДНА ВА ЎСЁЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РАЗГАРНУЦЬ САМУЮ НАСТОЙЛІВУЮ І ПАСЬЛЯДОЎНУЮ БАРАЦЬБУ З ФАКТАМІ НЕДАЦЭНЗКІ НІЗАВОГА ДРУКУ І РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ, КВАЛІФІКУЮЧЫ ГЭТЫЯ ФАКТЫ, ЯК ПРАЯВЫ ПРАВАГА АПАРТУНІЗМУ НА ПРАКТЫЦЫ.

Толькі гэтак, а ня інакш, толькі як праваапартуністычную практыку трэба кваліфікаваць гэткае становішча калі, да прыкладу, на АРШАНСКІМ ЧЫГУНАЧНЫМ ВУЗЬЛЕ мае месца РАЗВАЛ РАДУ цэхавых насьценных газэт. Характэрна адзначыць, што такі значны палітычны прарыў, як разваль некалькіх насьценных цэхавых газэт, меў месца на Аршанскім вузьле ПАСЬЛЯ адозвы СНК і ЦК УсеКП(б) аб чыгуначным транспарце, пасьля таго, калі патрабен быў яшчэ большы творчы ўздым усіх сіл рабочай клясы. Гэты факт, бязумоўна, зьяўляецца пэўнай характарыстыкай ЯКАСЬЦІ партыйнага кіраўніцтва Аршанскага чыгуначнага вузла.

З надрукаваных ва ўчарашнім нумары нашай газэты матар'ялаў відаць, як правільнае і сыстэматычнае кіраўніцтва нізавым друкам з боку партыйнай арганізацыі забясьпечвае нябачаны размах, рост сацыялістычнай ініцыятыўнасьці і актыўнасьці нізавога друку.

Досыць яскравы прыклад дае заводзкая друкаваная газэта Гомсельмаша — «Сельмашавец».

МЭТАД РАБОТЫ ЎДАРНЫМІ БРЫГАДАМІ ДРУКУ ПЕРАТВАРЫЎСЯ Ў АСНОЎНЫ МЭТАД УСЁЙ РАБОТЫ ГЭТАЙ ШМАТТЫРАЖКІ.

Ня гледзячы на рад асобных недахопаў (у прыватнасьці, недастатковую барацьбу за якасьць прадукцыі), «Сельмашавец» усё-ж такі — не рэгістратар фактаў, ня сшытак «исходящих» і «входящих», а — баявая, бальшавіцкая, апэратыўная газэта рэканструкцыйнага пэрыяду.

Газэта «Сельмашавец» зьяўляецца надзейным памочнікам заводнай партарганізацыі, газэта моцна трымае сваю руку на пульсе штодзённага жыцьця прадпрыемства.

Калі ў тым альбо іншым цэху намячаецца прарыў у выкананьні прамфінпляну, дык рэдкалегія «Сельмашаўца» перакідвае сваю работу непасрэдна ў гэты цэх і арганізуе там штодзённы выпуск насьценнай газэты «Трывога», мабілізуючы масы на тое, наб загадзя папярэдзіць прарыў, загадзя ліквідаваць, нават, небясьпеку прарыву.

«Сельмашавец» па-бальшавіцку вядзе барацьбу за ператварэньне ў жыцьцё баявога пёзунгу рабселькораўскага руху аб тым, ШТО «КОЖНЫ РАБСЕЛЬКОР—УДАРНІК, КОЖНЫ ЎДАРНІК — РАБСЕЛЬКОР».

Усесаюзная нарада падкрэсьліла неабходнасьць узмацніць на справе НЕПАСРЭДНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ МЯСЦОВЫХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЗА СТАНОВІШЧА НІЗАВОГА ДРУКУ І РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ, адзначыўшы неабходнасьць «... згуртаваць у дадны момант асабліваю ўвагу і намаганьні НА ПРАВЕРЦЫ ВЫКАНАНЬНЯ нізавымі партыйнымі арганізацыямі тых дырэктыў аб партыкіраўніцтве рабселькораўскім рухам і нізавым друкам, якія неадпаразова давяліся партыйнымі зьездамі і ЦК партыі».

Такім чынам, пры ацэнцы якасьці партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам мы павінны выходзіць з таго асноўнага крытэрыя, што КОЖНАЯ ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ, КОЖНАЯ ПАРТЫЙНАЯ ЯЧЭЙКА АДКАЗВАЕ ЗА СТАНОВІШЧА НІЗАВОГА ДРУКУ, ЯК ЗА ВАЖНЕЙШУЮ ПАРТЫЙНА-ПАЛІТЫЧНУЮ СПРАВУ.

Рабселькор-ударнік — стаў цэнтральнай фігурай рабселькораўскага руху.

У сваёй прамове ў 1930 г. (у габінэце рэдактараў пры ЦК УсеКП(б) тав. МОЛАТАЎ, закрануўшы пытаньне аб рабселькораўскім руху, адзначыў: «... У гэты час нельга гаварыць аб рабселькору наогул, трэба гаварыць аб рабселькорах-ударніках, асноўных работніках, якія даюць натхненьне і нясуць на сваіх плячох асноўны цяжар работы. З іх трэба складаць асноўныя кадры газэтных работнікаў, іменна з тых ударнікаў у прамысловасьці, ударнікаў - калгасьнікаў, якія могуць і маюць жаданьне пісаць. У брыгадах друку патрэбны тыя рабочыя, якія знаходзяцца на фабрыках і заводах, а ня тыя, якія круцяцца каля газэт. У нас ёсьць ударнікі фабрык і заводаў, калгасаў, якія могуць і жадаюць пісаць. Іх дзесяткі, сотні, тысячы. Іх трэба наблізіць, іх трэба расьціць».

Ні ў якім разе не забываючы аб рабоце сярод рабселькораў-адзіночак, уцягваючы іх ва ўдарныя брыгады друку, мы, разам з тым, асабліва моцны УПОР павінны зрабіць на сыгналізацыі Усесаюзнай нарады аб тым, што: — «... Многімі газэтамі не даволі рашуча ажыцьцяўляецца пёзунг «кожны рабселькор — ударнік, кожны ўдарнік — рабселькор». Газэты часта ня ўмеюць СТАЦЬ НА ЧАЛЕ актыўнасьці мас рабселькораў-ударнікаў і калгасьнікаў, пакідаючы іх без ідэйнага і арганізацыйнага кіраўніцтва, гэтым самым аб'ектыўна зьніжаючы размах масавай ініцыятывы і творчасьці рабселькораў-ударнікаў».

Некалькі дзён таму назад прадстаўніцтвам газэты «Правда», разам з рэдакцыяй газэты «Рабселькор», быў праведзен «напёт» на рэдакцыі цэнтральных газэт БССР.

«Напёт» павінен быў выявіць, наколькі ўдарніцтва ператварылася ў штодзённы мэтад работы, як у саміх рэдакцыях, так і ў масе рабселькораў, якія абяднаны навакол газэт.

«Напёт» з усёй выразнасьцю паказаў, што ЗНАЧНАЯ ЧАСТКА ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ БССР І ДА ГЭТАГА ЧАСУ ЯШЧЭ НЕ ПЕРАБУДАВАЛА У НАЛЕЖНАЙ МЕРЫ СВАЮ РАБОТУ Ў СУАДПАВЕДНАСЬЦІ З ПАТРАБАВАНЬНЯМІ РЭКАНСТРУКЦЫЙНАГА ПЭРЫЯДУ.

Пэўная частка цэнтральных газэт, як газэта «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», часткова «АКЦЯБР» і іншыя яшчэ ня сталі на чале ўдарніцкага руху ў друку.

СТВАРЭНЬНЕ СПЭЦЫЯЛЬНАЙ ГАЗЭТЫ ПА ПЫТАНЬНЯХ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ, НІЗАВОГА І РАЁННАГА ДРУКУ — «РАБСЕЛЬКОР»—НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЯ ЗДЫМАЕ АДКАЗНАСЬЦІ З ЦЭНТРАЛЬНЫХ І РАЁННЫХ ГАЗЭТ ЗА СПРАВУ ШТОДЗЕННАЙ ДАПАМОГІ І КІРАЎНІЦТВА РАБСЕЛЬКОРАЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ І НІЗАВЫМ ДРУКАМ.

Высоўваючы перад усім друкам задачу ўсямернага разгортваньня ўдарніцкага руху, УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА ЗАКЛІКАЛА «РАБОТНІКАЎ ДРУКУ І РАБСЕЛЬКОРАЎ ДА РАШУЧАЙ БАРАЦЬБЫ З СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕМ І ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ НЕДАЦЭНКАЙ З БОКУ АСОБНАЙ ГРУПЫ РАБОТНІКАЎ ДРУКУ СПРАВЕ РАЗГОРТВАНЬНЯ ЎДАРНЫХ БРЫГАД, УЦЯГНЕНЬНЯ ПРАЗ ГЭТУ ВЫШЭЙШУЮ ФОРМУ РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ НАЙШЫРЭЙШЫХ МАС ПРАЛЕТАРАЎ, КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ У АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У НАШЫМ БАЛЬШАВІЦКІМ ДРУКУ».

Нам патрэбна, як запісала ў сваіх пастановах нарада, таксама з усёй рашучасьцю ВЫКАРЧОЎВАЦЬ ДЗЯЛЯЦКІЯ, ЯЎНА-АПАРТУНІСТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ НЕКАТОРЫХ ГАЗЭТ ДА РАБСЕЛЬКОРАЎ І ЎДАРНЫХ БРЫГАД, ЯК ДА «ПАСТАЎШЧЫКОЎ ГАЗЭТНАГА МАТАР'ЯЛУ», ЯК ТОЛЬКІ ДА ІНФАРМАТАРАЎ, бо гэта «адлюстроўвае праваапартуністычныя погляды тых. Бухарына і інш. на рабселькораў. ПРАКТЫКА ВУЗКА - «СПАЖЫВЕЦКАГА» ПАДЫХОДУ ДА РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА РУХУ І ЯГО ВЫШЭЙШАЙ ФОРМЫ — УДАРНАГА РУХУ Ў ДРУКУ — ПРЫВОДЗІЦЬ ЧАСТА ДА ПОЎНАГА СКАЖЭНЬНЯ ІДЭІ ЎДАРНІЦТВА Ў ДРУКУ — ударных брыгад, рэйдаў, замазваньня на справе актыўна-арганізацыйных функцый ударных брыгад і ператварэньня іх выключна ў «наглядальныя», «дазорныя» пасты...».

Такім чынам, ВУЗЛАВАЯ ЗАДАЧА — забясьпечыць КРУТЫ пераломм у справе ўзмацненьня практычнай дапамогі і кіраўніцтва нізавым друкам з боку усіх мясцовых партарганізацый, а таксама цэнтральных і раённых газэт.

Неабходна заваяваць цэнтральнае перабудову сеткі нізавога друку пад кутом узмацненьня арганізатарскай ролі друку ў выкананьні асноўных гаспадарча-палітычных задач партыі, у прыватнасьці, у выкананьні пёзунгу тав. Сталіна аб апаладаньні тэхнікай, пад кутом павышэньня ролі друку ў барацьбе за трэці — рашаючы — год пяцігодкі, за генэральную лінію партыі, супроць правага — найбольш небясьпечнага ўхілу, супроць «левых» загібаў, супроць скажэньняў ленінскай нацыянальнай палітыкі і прымірэнцтва да ўхілаў.

Масавая праверка становішча самакрытыкі ўнутры партыйнай і рабочай дэмакратыі, яную пачынае ЦКК КП(б)Б, павінна яшчэ вышэй узьняць ролю рабселькораўскага руху і ўсяго друку ў барацьбе за самую шырока разгорнутую пралетарскую самакрытыку і за дзейнасьць гэтай самакрытыкі, як адной з мацнейшых зброй камуністычнай партыі і рабочай клясы ў барацьбе за сацыялізм.

У СЁНЕШНІМ НУМАРЫ НАМІ ДРУКУЕЦЦА ПАСТАНОВА БЮРО МЕНСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б ПА ПЫТАНЬНІ АБ НЕДАПУШЧАЛЬНА-СЛАБОЙ ЯЎЦЫ НА МЕНСКІ АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ, ЯКІ ПАВІНЕН БЫЎ АДБЫЦЦА УЧОРА, 10 САКАВІКА.

Бюро гаркому КП(б)Б зусім правільна ацаніла яўна нездавальняючую яўку на агульна-гарадзкі сход партыйнага актыву, які павінен быў заспухаць даклад прадстаўніка ЦО УсеКП(б) — газэты «Правда», як праяву недаацэнкі рабселькораўскага руху і нізавога друку з боку некаторай часткі бюро партыйных калектываў і ячэек.

Прадстаячы 16-га сакавіка паўторны агульна-гарадзкі сход менскага партыйнага актыву павінен будзе прайсьці пад адзнакаю таго, што ўся партыйная арганізацыя ў цэлым, кожная партыйная ячэйка паасобку нясе адказнасьць за становішча і партыйнае кіраўніцтва рабселькорамі і друкам, гэтай «... самай моцнай, самай вострай зброі партыі...» (Сталін).

# ПРЫГАВАР НАД ЗДРАДНІКАМІ-МЕНШАВІКАМІ—

## МАГУТНЫ ЎДАР ПА ІНТЭРВЭНЦЫЯНІСЦКІХ ЗАМЫСЛАХ

## сацыял - фашысцкага Інтэрнацыяналу

Імем Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік спэцыяльная судовая прысутнасьць Вярхоўнага суда Саюзу ССР, у складзе старшыні **М. М. Шэрэніна, членаў— М. К. Муранава і В. П. Антонава-Саратаўскага,** пры сакратарох **Г. Р. Смоліцкім, Н. Д. Дуброўскім і М. Ф. Якаўлеве,** з удзелам дзяржаўных абвінаваўцаў — пракурора РСФСР **Н. В. Крыленка** і памочніка пракурора РСФСР — **Г. К. Рэгінскага** і абароны—членаў Маскоўскай калегіі абаронцаў — **Камодава Н. В. і Браўдэ І. Д.,** разгледзеўшы на адкрытым судовым пасяджэньні з 1 па 9 сакавіка 1931 году справу контр-рэвалюцыйнай арганізацыі—«Саюзнае бюро» ЦК РСДРП (меншавікоў) па абвінавачваньні:

**Громана Ў. Г., Шэрэ В. У, Суханава М. М., Гінзбурга А. М., Янубовіча М. П., Сакалоўскага А. Л., Залкінда Л. Б., Воўкава І. Г., Патуніна К. Г., ФінЕкатаеўскага А. Ю., Бэрлацкага Б. А.** у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58-11, 58-7, 58-4 Крымінальнага Кодэксу РСФСР.

**Івава Ў. К. і Тэйтэльбаума М. І.** у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58-11, 58-4 Крымінальнага Кодэксу РСФСР.

**Рубіна І. І.** у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58-11, 58-4, 58-10 КК РСФСР,

Заслухаўшы паказаньні падсудных і сьведак, справакі бакоў, разгледзеўшы ўсе матар'ялы, што маюцца па справе, спэцыяльная судовая прысутнасьць устаноўлена:

У другой палове 1930 г. у Маскве выкрыта шкодніцкая арганізацыя, якая мела свае адзіналіванаўні ў розных частках дзяржаўнага апарату. На чале гэтай арганізацыі стаяла група, якая аказалася «Саюзным бюро» Цэнтральнага Камітэту расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў), уваходзячых у склад 2-га Інтэрнацыяналу ў якасьці яго сэкцыі. Азначанае бюро арганізавалася і зацьверджана сваім Цэнтральным Камітэтам у пачатку 1928 г. У склад бюро ўвайшлі найбольш выдатныя ў сваім асяродзьдзі сацыял-дэмакраты (меншавікі), якія займалі, у большасьці, адказныя пасады ў цэнтральных установах савецкай дзяржавы, а іменна: В. Г. Громан, В. В. Шэр, А. М. Гінзбург, А. Л. Сакалоўскі, Л. Б. Залкінд, М. П. Якубовіч, І. Г. Воўкаў, К. Г. Пятунін, А. Ю. Фін-Енатаеўскі і з пачатку 1929 г. М. М. Суханаў, прычым, кіруючымі асобамі сярод іх былі: **Громан, Шэр, Гінзбург, Суханаў.**

Для вядзеньня шкодніцкай і контррэвалюцыйнай работы бюро мела прэзыдыум, пленум і рад камісій: **праграмную, арганізацыйную, ваенную і фінансавую.**

Хаваньне партыйных дакумантаў было ўскладзена на сакратароў «Саюзнага бюро»—**Шэрэ і Рубіна,** друкаванай тэхнікай ведаў **Янубовіч.** Для ўвязкі сваёй дзейнасьці з дзейнасьцю заграніччнага цэнтру расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў), месца прабываньня якога знаходзілася ў Бэрліне «Саюзнае бюро» ўстанавіла праз членаў сваёй арганізацыі **В. К. Івава і А. Ю. Фін-Енатаеўскага** рэгулярныя пісьмовыя адносіны, а праз падарожны членаў бюро (**Громана, Пятуніна, Гінзбурга і іншых**) заграніцу і членаў заграніччнага цэнтру расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) (Абрамовіча, Браўнштэйна і інш.) у Маскву—сувязь непасрэдную. У цесным узаемадзеяньні паміж «Саюзным бюро» і заграніччным меншавіцкім цэнтрам у апошнія гады была выпрацавана новая тактыка барацьбы расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) супроць савецкай улады. Зьяўляючыся праціўнікамі пралетарскай дыктатуры, прыхільнікамі адпаўленьня капіталізму ў Саюзе Савецкіх Сацыялістычных рэспублік, што вяўляецца з іх плянфармы, прыйшлі ў Бэрліне ў 1924 г., палітычна абанкрутаваўшыя ў пэрыяд рэвалюцыі, удзельнікі грамадзянскай вайны на баку царскіх генэралаў, капіталістаў і інтэрвэнтаў, страціўшыя ўсякую апору ў рабочай клясе, —расійскія сацыял-дэмакраты (меншавікі) разлічвалі на перарадзжаньне савецкай улады, на адміраўленьне капіталізму ў результаце НЭПу. З прычыны таго, што гэтыя разлікі не апраўдаліся, а савецкая улада павяла рашучае наступленьне на капіталістычныя элементы, пасьпяхова будуючы сацыялізм у сваёй краіне, расійскія сацыял-дэмакраты (меншавікі) перайшлі да новай тактыкі —**накіраванай на зьвяржэньне савецкай улады шляхам шкодніцтва ў сацыялістычнай гаспадарцы, пры дапамозе ўбрсенай інтэрвэнцыі. Судовае следзтва ўстанавіла, што шкодніцтва праводзілася ўсімі членамі «Саюзнага бюро»,** членамі асобных шкодніцкіх ячэек, створаных сацыял-дэмакратамі (меншавікамі) у радзе савецкіх устаноў. Шкодніцтва гэта зводзілася да наступнага:

А. **У дзяржаўнай плянавай камісіі:** правядзеньне ў кантрольных лічбах, ка[illegible]ктурных аладах народнай гаспадаркі заведама варожых палітыцы савецкай улады плянавых пабудоў, заведама скажоных кан'юнктурных ацэнак, адстойваньне ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы і іншых галінах народнай гаспадаркі мерапрыемстваў, якія прыводзілі да тармажэньня, да заведамага арыву і дэзарганізацыі гэтых галін народнай гаспадаркі. (Громан).

В. **Па ВСНГ:** праектаўроўка росту прадукцыі па пяцігадовым пляне давалася, у мэтах арыву сацыялістычнага будаўніцтва, у мінімальных разьмерах, у асаблівасьці па такіх відучых галінах народнай гаспадаркі, як мэталь, вугаль, нафта, хэмія, электратэхніка, а таксама с.-г. машынабудаўніцтва, штучнае ўгнаеньне **(Гінзбург).**

Распрацоўка і нарэдстаўленьне такіх кан'юнктурных аладаў па прамысловасьці, якія ня толькі не садзейнічалі сацыялістычнаму будаўніцтву, але заблытвалі кіруючыя гаспадарчыя колы **(Гінзбург),** супроцьдзеньне ажыцьцяўленьню ўзятых савецкай уладай тэмпаў разьвіцьця мэталюргічнай і машынабудаўнічай, мэталапрацоўчай прамысловасьці **шляхам затрыманьня разьвіцьця заводаў гэтай прамысловасьці і, ў прыватнасьці, заводаў - гігантаў — Магнітагорскага, трактарнага Сталінградзкага** (Гінзбург), **устанаўленьне разрыву паміж тэмпамі фінансаваньня і тэмпамі будаўніцтва ў галіне машынабудаўніцтва, у прыватнасьці, недафінансаваньне Ленінградзкага машынабудаўнічага трэсту, Сталінградбуду, Растоўскага заводу сельска-гаспадарчых машын (Воўкаў), пабудова і правядзеньне мінімалісцкіх тэмпаў па сырцовай пяцігодцы, у асаблівасьці па бавоўне (Сакалоўскі).**

В. **Па дзяржаўным банку:** правядзеньне, у мэтах разбурэньня народнай гаспадаркі і грашовага звароту ў краіне, заведама ня[illegible]вальнага разьмеркаваньня крэдытаў **(Шэр),** у мэтах арыву крэдытнай рэформы шкодніцкімі сацыял-дэмакратамі (меншавікамі) заведама ня ўжываліся меры па падрыхтоўцы крэдытнай рэформы, своечасова не пасьлаліся цыркуляры на месцы або мелі заведамую шляпасьць дырэктыў, яны зносілі разбураньне ў сыстэму крэдытаваньня **(Шэр),** заведама расхіталі вучот і статыстыку банку, што паслабляла нагляд банку за запазычанасьцю гаспадарчых органаў і пазбаўляла банк тэй мануўранасьці, якая была патрэбна яму ў барацьбе з парушэньнямі пляну **(Бэрлацкі).**

Г. **Па Народным камісарыяце гандлю і Цэнтрасаюзе:** шкодніцкі—сацыял-дэмакраты (меншавікі), у мэтах выкліканьня нездавальненьня сярод працоўных гораду і вёскі, а таксама ў мэтах арыву загатоўчых апэрацый, складалі такія пляны завозу тавару ў вёску, пры якіх атрымлівалася перазабесьпячэньне адных раёнаў і недазабесьпячэньне другіх, накіроўваліся тавары не да сэзону або неадпавядальны попытку асартымент, прычым, сыстэматычна праводзілі недазабесьпячэньне тавараэ рабочых цэнтраў і раёнаў **(Залкінд, Янубовіч, Пятунін).** Фінансаваньне спажывецкай кааперацыі было пастаўлена так, што значна замаруджваўся тавараварот кааперацыі, што выклікала неабходнасьць крэдытаваньня яе за кошт дзяржаўнага банку **(Шэр).**

Д. **Па Цэнтрасаюзе:** павышэньне цэнаак, якія адбіваліся на рэальнай зарплаце; утойваньне сродкаў кааперацыі, у прыватнасьці, разьмерай бягучага накапленьня; невыкананьне пастановы ураду на аварце кааперацыяй сродкаў, у свой час адпушчаных ёй урадам; згортваньне тэмпаў капітальнага кааперацыйнага будаўніцтва, у выніку чаго зларыўся прарыў у будаўніцтве нафтахавалень; затрыманьне ў складаньні будаўнічых праектаў; супраціўленьне ўключэньню спажывецкай кааперацыі ў сферу дзесяцьгадовага крэдытнай рэформы.

Судовае следзтва ўстанавіла, што на маючы ніякай апоры сярод рабочае клясы — ў бядняцка-серадняцкіх масах вёскі; нацыянэўны наўдачу ў спробах нават пляхам шкодніцтва выклікаць нездавальненьне ў масах, узьнікшае іх супроць савецкай улады,—расійскія сацыял-дэмакраты (меншавікі) прышлі да прызнаньня **неабходнасьці інтэрвэнцыі і ўзмацненьня шкодніцкай работы ў мэтах актыўнай падрыхтоўкі яе.** Гэта ўстаноўка на інтэрвэнцыю ўзьнікла і ў «Саюзнаму бюро» і ў заграніччным цэнтры расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў), прычым, апошні настойліва высоўваў гэту ўстаноўку перад «Саюзным бюро».

Ужо ў канцы 1927 году **Абрамовіч і Дан**—кіруючыя асобы заграніччнага цэнтру расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў), паставілі перад «Саюзным бюро» гэта пытаньне. Улетку 1928 году Абрамовіч, нелегальна прыехаўшы ў Маскву, на нарадзе «Саюзнага бюро» настойваў на прыняцьці інтэрвэнцыі, як адзінага выхаду для расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) у іх барацьбе супроць савецкай улады. «Саюзнае бюро» прасіла Абрамовіча прыслаць з-заграніцы пісьмовую дырэктыву па гэтым пытаньні; такая дырэктыва была дасталена праз Івава. Прыехаўшы ў 1929 годзе таксама, як і Абрамовіч, нелегальна ўнаўважаючы таго-ж заграніччнага цэнтру расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) Браўнштэйн яшчэ раз пацьвердзіў, што **заграніччны цэнтр узяў курс на інтэрвэнцыю і патрабуе ад «Саюзнага бюро» самай актыўнай работы ў гэтым напрамку.** Другі пленум «Саюзнага бюро» ўвосень 1929 году абмеркаваў дырэктыву аб інтэрвэнцыі і прыняў пастанову аб тым, што **«інтэрвэнцыя зьяўляецца неабходнай зброяй барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту і савецкай улады» і з гэтага часу ўся работа «Саюзнага бюро» была падпарадкавана гэтай пастанове.** Судовае следзтва ўстанавіла, што прыняцьце курсу на інтэрвэнцыю і шкодніцтва, як сродак яе падрыхтоўкі, прывяло расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) да заключэньня цеснага палітычнага блёку з кулацка-эсэраўскай контр-рэвалюцыйнай партыяй Кандрацьцева-Чаянава і «прамысловай партыяй», якая зьяўлялася інтэрвэнцыяністкай шпіёнска-шкодніцкай арганізацыяй буйной буржуазіі. Усе гэтыя контр-рэвалюцыйныя арганізацыі на супольнай нарадзе сваіх кіраўнікоў у пачатку 1929 году разьмеркавалі паміж сабой функцыі барацьбы з савецкай уладай, а іменна: **«прамысловая партыя» узяла на сябе** праз пасрэдніцтва арганізацыі рускіх буйных капіталістаў, што ўцяклі ад пралетарскай рэвалюцыі, якая (арганізацыя) знаходзіцца ў Парыжы (Манташава, Дзяніса, Рубашынскага, Гукасава, Канавалава, Нобеля і іншых) і называе сябе «Торгпромам» — **перагаворы з інтэрвэнцыяністкімі ўрадамі і іх генэральнымі штабамі ад арганізацыі падрыўных (дыверсыйных) груп, фармаваньне контр-рэвалюцыйных элементаў сярод інжынэрна-тэхнічнай інтэлігэнцыі, шкодніцтва па галінах прамысловасьці: кулацка-эсэраўская партыя Кандрацьцева-Чаянава ўзяла на сябе арганізацыю кулацкіх паўстаньняў, забесьпячэньне паўстанцаў зброяй і харчамі, арганізацыйную работу і контр-рэвалюцыйную работу сярод спэцыялістаў сельскай гаспадаркі, шкодніцтва ў галінах гэтай гаспадаркі.**

**Рускія сацыял-дэмакраты (меншавікі)** з адабрэньня свайго заграніччнага цэнтру **узялі на сябе шкодніцтва ў агульным і спэцыяльным плянаваньні народнай гаспадаркі і канкрэтнае шкодніцтва ў галіне загатовак збожжа, сырцу для прамысловасьці, разьмеркаваньня прамысловых тавараў, рабочага забесьпячэньня, а таксама ў галіне фінансаваньня крэдыту і апарата таго, яны абавязаліся пры пасрэдніцтве свайго заграніччнага цэнтру і II Інтэрнацыяналу ўжыць меры па падрыхтоўцы такой грамадзкай думкі працоўных, у асаблівасьці сусьветнага пралетарыяту, пры якой Інтэрвэнцыя ў краіне Саветаў ня сустрэла-б з іх боку супраціўленьня.**

Судовае следзтва ўстанавіла, што для ажыцьцяўленьня шкодніцкай работы і апаратам непасрэднага шкодніцтва расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікі) дагаварыліся з контр-рэвалюцыйнай арганізацыяй буйной буржуазіі—«прамысловай партыяй» аб атрыманьні ад яе грашовай дапамогі, што накіроўвалася з Парыжу ад «Торгпрома» і зьвязаных з ім інтэрвэнцыяністкіх колаў і праз казначэя Цэнтральнага Камітэту «прамысловай партыі», Ларычава, **атрымалі на працягу 1929-30 году 200 тысяч рублёў.**

**Другой крыніцай фінансаваньня шкодніцкай работы расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) была нямецкая сацыял-дэмакратыя і 2 Інтэрнацыянал.** Групы з гэтай крыніцы накіроўваліся «Саюзнаму бюро» праз заграніччны цэнтр рускіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) і тэхніка праз **Фін - Енатаеўскага і Громана.**

З гэтай крыніцы «Саюзным бюро» Цэнтральнага Камітэту расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) было атрымана **280 тысяч рублёў;** апрача таго, у пачатку шкодніцкай дзейнасьці былі атрыманы 210 тысяч рублёў перададзеных праз Шурыгіна Пятуніным і 135 тыс. руб. ад «прамысловай партыі» праз Шэпша Залкіндам. **Усяго было атрымана 515 тыс. руб.**

Побач з гэтым, на судовым пасяджэньні высьветлілася, што свае ўдачыную контр-рэвалюцыйную работу на падрыхтоўцы інтэрвэнцыі і фінансаваньні ў гэтых мэтах шкодніцкай работы «Саюзнага бюро» замежны цэнтр расійскіх сацыял-дэмакратаў (меншавікоў) праводзіў з ведама і згоды II Інтэрнацыяналу, які прыкрываў гэту работу і аказваў праз нямецкую сацыял-дэмакратыю ім грашовую дапамогу. У тойжа час II Інтэрнацыянал (Вэльс, Гільфердынг, Блюм), дзеўушніцы, выступаючы супроць інтэрвэнцыі, разьвіваў контр-рэвалюцыйную дзейнасьць супроць СССР, падрыхтоўваючы тым грамадзкую думку рабочых да вызначнай інтэрвэнцыі, дапамагаючы гэтым дзеяньніцкім замыслам імпэрыялістоў супроць СССР.

На падставе артыкулу 326, частні 3, Крым. К. РСФСР спэцыяльная прысутнасьць Вярхоўнага суда Саюзу ССР прыгаварыла:

**Тэйтэльбаума,** Майсея Ісаевіча — да пяці гадоў пазбаўленьня волі з паражэньнем у правах на два гады.

**Рубіна,** Ісаака Ільвіча—да пяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правах тэрмінам на два гады.

**Воўкава, Івана Рыгоравіча**—да пяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правах тэрмінам на два гады.

**Сакалоўскага,** Арона Львовіча—да васьмі год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правах, тэрмінам на тры гады.

**Залкінда,** Лазара Барысавіча—да васьмі год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правах тэрмінам на тры гады.

**Бэрлацкага,** Барыса Маркавіча—да васьмі год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правах тэрмінам на тры гады.

**Івава,** Уладзімера Кастуёва—да васьмі год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правах тэрмінам на тры гады.

**Пятуніна,** Кірыла Гаўрылавіча—да дзесяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правах тэрмінам на пяць год.

**Фін-Енатаеўскага,** Аляксандра Юльвіча—да дзесяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правах тэрмінам на пяць год.

**Янубовіча,** Міхаіла Пятровіча—да дзесяці год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правах тэрмінам на пяць год.

**Гінзбурга,**

# Выкараненьне права-апартуністычнай практыкі —асноўная ўмова пасьпяховага разгортваньня калектывізацыі

## З БАЛЬШАВІЦКАЙ НЕПРЫМІРЫМАСЬЦЮ БІЦЬ на ЎСЯЛЯКІХ СПРОБАХ АПАРТУНІСТАЎ СКАРАЦІЦЬ ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ, па АПАРТУНІСТЫЧНАЙ СТАЎЦЫ на САМАЦЁК У АРГАНІЗАЦЫІ НОВАГА КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ

## Засьмечанасьць клясава-варожымі элемэнтамі Касьцюковіцкай арганізацыі—рэзультат прытупленьня палітычнай пільнасьці яе былога кіраўніцтва

## Да чаго давяла апартуністычная практыка

Клясавы вораг у барацьбе супроць сацыялістычнага наступленьня ўжывае розныя мэтады антысавецкай агітацыі, шкодніцтва і тэрору. Адказваючыя варожым нам клясы—кулацтва ў вёсцы і гарадзкая буржуазія — наймаць імкнуцца выкарыстаць усякае паміжвасьце пасьлабленьне клясавай пільнасьці ў рабоце пасобных элементаў партыйнай арганізацыі, савецкіх, гаспадарчых і інш. органаў для таго, каб пралезьці на той ці іншы вучастак сацыялістычнага будаўніцтва ў мэтай шкодніцкай, падрыўной работы. Апартуністычныя элемэнты ў гэтых адносінах, хочуць яны гэтага ці ня хочуць, зьяўляюцца простымі дапаможнікамі клясаваму ворагу.

Бяз самай бязьлітаснай барацьбы на два фронты з ухілам ад генэральнай лініі партыі, скацэнтроўваючы талоўны ўдар на правым апартунізьме, немагчымы былі тым посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, з якімі ўвайшла рабочая клясэ, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у трэці рашаючы год пяцігодкі. Бяз гэтай барацьбы немыслімa пасьпяховае выкананьне гістарычнай важнасьці задач трэцяга рашаючага году, у якім завяршаецца пабудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі Савецкай краіны.

Ідэалёгія правага ўхілу выкрыта партыяй да канца і асуджана як кулацкая ідэалёгія.

Да чаго даводзіць апартунізм на практыцы, ясна гаворыць становішча, якое стварылася ў **Касьцюковіцкім** раёне. Былое партыйнае кіраўніцтва гэтага раёну, праводзячы права - апартуністычную практыку, выконвала сацыяльны заказ клясавага ворага, аслабляла пралетарскія пазыцыі ў вёсцы, спрыяла кулацкім шкодніцкім элементам праводзіць варожую дзейнасьць супроць сацыялістычнага будаўніцтва. Апартуністы дапусьцілі засьмечанасьць клясава - варожымі элементамі ня толькі раду устаноў, а ў значнай частцы і партыйнай арганізацыі. Росквіт у арганізацыі пакрысе правага апартунізму, пры поўнай натуральнай з боку былога раённага парткіраўніцтва, прошчаньне раду кумуністаў з кулацкімі элементамі, засьмечанасьць раду ячэек яўнымі кулакамі і былымі бандытамі — асноўная крыніца камбэкіх прарываў у работу Касьцюковіцкай партарганізацыі.

Месцэвая прамысловасьць у гэтым раёне дае сыстэматычныя прарывы, нават адна вучотку ступені выкананьня прамфінпляну. У райКК ёсьць весткі аб выкананьні прамфінпляну на 50 проц., а у райвыканкоме — на 30-70 проц. Лесапільная прамысловасьць выканала плян толькі на 6 проц.

Па кладзячы на гэтыя прарывы, раёнае кіраўніцтва ня ўжывала ніякіх захадаў да іх ліквідацыі. Пакат на раённым сьвяце гэта сьмяшне абвяшчі моўчы. Саматужныя арцелі—дрэваапрацоўчыя, швейныя, абутковая і інш. засьмечаны кулацкімі і непманскімі элементамі, якія праводзяць там яўнае шкодніцтва.

У раёне спажывецкай кааперацыі — суцэльнае злачынства. Ніякага клясавага прынцыпу у разьмеркаваньні дэфіцытных тавараў ня было. Пры абсьледваньні работы кааперацыі знойдзена 2 тыс. заявак розных раённых работнікаў, на якіх адпускаліся дэфіцытныя тавары. Установлен недахват 200 тон збожжа. Загадчыкамі кааперацыйных крам у раёне па палову зьяўляліся кулакі і непманы.

У канторы Белмяса ўстаноўлена растрата ў 800 руб., недахват некалькіх дзесяткаў буйной і дробнай жывёлы. На разбазараную жывёлу складаліся фіктыўныя акты аб падажы. На ўсе гэтыя абуральныя факты значыньства і шкодніцтва партарганізацыя сваячасова не рэагавала. Характэрна, што пасьля абсьледваньня работы кааперацыі некалькі раз склікаўся сход Касьцюковіцкай ячэйкі (ячэйка складаецца пераважна з раённага партактыву), але ніхто не зьяўляўся. Вось якія адносіны да задачы ліквідацыі прарываў у рабоце кааперацыі.

У радзе партячэек ідуць права-апартуністычныя адносіны да задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Аб гэтым ярка сьведчаць факты зусім невыстарчальнага ўдзелу камуністаў у калектывізацыі. З 258 членаў раённай партарганізацыі толькі 43 чал. зьяўляюцца калгасьнікамі, прычым, частка партыйцаў увайшла ў калгасы фармальна, у рабоце ніякага ўдзелу ня прымае. Больш таго, за апошні час былі ўлена, што партыйныя білеты аныпулёваны ў руках яўных кулакоў, якія пралезьлі ў партыю з мэтай дэзарганізатарскай варожай дзейнасьці. Так, на чале **Бяпынкавіцкай** ячэйкі стаяў сакратар — былы бандыт — Якушоў Раман. Рад кулацкіх элементаў, якія лічыліся партыйцамі гэтай ячэйкі, уступіўшы ў калгас, ня толькі не працавалі там і не абагульвалі сваёй маемасьці, а эксплёатавалі пасобных калгасьнікаў на рабоце ва ўласных гаспадарках і праводзілі шкодніцкую работу ў калгасе.

**Сялецкаўская** ячэйка высунула на кіруючую работу старшынёй праўленьня калгасу кулака, які меў 25 гэкт. зямлі. Другі кулак таксама выкарыстаў палітычную сьлепоту і апартуністычную практыку Боркавіцкай ячэйкі, які сваё знаходжаньне ў партыі і службовае становішча на кіруючай рабоце ў калгасе выкарыстаў для ўсямцаньня ўласнай гаспадаркі і шкодніцкай дзейнасьці супроць калектывізацыі.

Гэтыя факты не адзінкавы. За апошні час выключана ў складзе партыйнай арганізацыі каля 20 чужакоў. Частка з іх — былыя бандыты (Глушакоў Н., Патапенка, Сідаренка), астатнія (Максіменка А., Самусенка, Арэхаў, Марчанка, Хомчанка, Шэўчэнка і рад інш.) аказаліся яўнымі кулацкімі элементамі і махровымі правымі апартуністамі, якія выкарыстоўвалі сваё знаходжаньне ў партыі і службовае становішча для дапамогі кулацтву і ўсямерна процідзейнічалі выкананьню задач партыі на вёсцы.

При такой засьмечанасьці варожымі элементамі пасобныя ячэйкі Касьцюковіцкай раённай партарганізацыі ня толькі сталі ў баку ад калектывізацыі, а пакат у некаторых выпадках ігіраваді актыўнасьць бядняцка-серадняцкіх мас у справе калгаснага руху. **Беладуброўская** ячэйка, апынуўшыся у палоне правага апартунізму, упарта не хацела праводзіць работы па калектывізацыі. Беднота і сераднякі 5 раз падавалі заявы ў гэту ячэйку аб арганізацыі калгасу, але падтрыманьня ніякага не дабіліся да таго, пакуль ня прыехаў прадстаўнік з райкому, які адразу арганізаваў там два калгасы.

Кулацтва ў многіх сельсаветах, па міласьці мясцовых апартуністаў, карысталася льготамі, не абкладалася ў індывідуальным парадку і не атрымлівала пьёрдых заданьняў на розных відах загатовак. Райвыканком (у мінулым складзе) таксама на працягу доўгага часу сабатаваў дырэктывы райкому па пытаньні выяўленьня і абкладаньня падаткам кулацкіх гаспадарак. Толькі пасьля абяцяньня вымовы фракцыі райвыканкому, у гэтым напрамку была праведзена сякая-такая работа па савецкай лініі.

Паказаныя факты грубага скажэньня дырэктыў партыі ў Касьцюковіцкім раёне зьяўляюцца далёка ня поўнымі. Клясавы вораг выкарыстаў права-апартуністычную практыку былога раённага парткіраўніцтва ў сваёй дзейнасьці, учыніўшы шмат перашкод на радзе важнейшых пучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва. Гэты урок для Касьцюковіцкай раённай партарганізацыі, якая ня выкарыстала дзейснай зброі — пралетарскай самакрытыкі — бальшавіцкага змаганьня супроць апартуністычнага кіраўніцтва, не панесла руйнуючага ўдару па агентуры клясавага ворага — пакінен быць улічан кожнай партыйнай арганізацыяй.

Цяперашняе партакіраўніцтва Касьцюковіцкага раёну разгарнула работу па ліквідацыі спадчыны дзейнасьці апартуністаў былога складу райкому і райвыканкому. Зараз праводзіцца самаачыстка партячэек ад клясава-чужых элемэнтаў. Выкрытыя злачынцы, шкодніхі адданы пад суд. Касьцюковіцкая раённая партарганізацыя ў асноўным здаровая і баздольная пераключаецца ў сваёй рабоце і мабілізуе шырокія масы калгасьнікаў, бядняцкой і серадняцкой па выкананьне важнейшых задач партыі па калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя бядняцка-серадняцкіх гаспадарак з 11,2 проц. на становішчы на 1 кастрычніка 1930 году даведзена да 23 проц. на 20 лютага гэтага году. Арганізавана 5 новых і пашырана 2 існуючых сьвінагадоўчых саўгасы на плошчы 10 тыс. гэктараў.

Абмеркаваўшы становішча работы Касьцюковіцкай раённай партарганізацыі, бюро ЦК КП(б)Б і прэзыдыум ЦКК вызначылі рад канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на ўзадараўленьне становішча ў гэтым раёне. Паслан рад работнікаў на пастаянную кіруючую работу ў раёне. У дапамогу райкому па ліквідацыі прарываў пасланы член партколегіі ЦКК і інструктар ЦК КП(б)Б тэрмінам на 2 месяцы.

Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК прызналі неабходным арганізаваць у гэтым раёне сёлета машына-трактарную станцыю, даручана сэктару друку арганізаваць раённую газэту і г. д.

Касьцюковіцкая раённая партарганізацыя ў сваёй асноўнай масе зьяўляецца ідэалёгічна здаровай, яна вялее пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б ліквідаваць прарывы ў сваёй рабоце і па-бальшавіцку мабілізуецца на выкананьне задач партыі, рашуча ачышчаючы свае рады ад агентуры клясавага ворага, нанесучы бязьлітасны ўдар па ўхілах ад генэральнай лініі партыі, па ўсіх правых апартунізму.

**Ів.**

## Ня даць развалі́цца камуне

Камуна імя Леніна (Гарадецкі раён) — адна са старэйшых камун. Арганізавадася яна ў 1920 годзе. Да мінулага году гэта камуна лічылася адной з лепшых у раёне. Летась увесну, у пэрыяд, калі мясцовыя работнікі дапусьцілі рад перагібаў «лявацкага» парадку і «калектывізавалі ўвесь сельсавет» і ўлілі ў камуну імя Леніна 1.196 гаспадарак, яна ператварылася ў гігант на плошчы 5 тысяч га. Ня гледзячы на такое «узбуйненьне», у камуне ня было каму працаваць. У часе адліву гаспадарчая моц камуны была падарвана. Прычына заключаецца ў тым, што новапрыбыўшыя члены камуны былі забясьпечаны вопраткай, абуткам і г. д. са сродкаў камуны.

На сённяшні дзень камуна мае запазычанасьці 130 тысяч рублёў, пры агульным конце гаспадаркі ў 150 тысяч рублёў. Раённыя ўстановы і райпартарганізацыя не падумалі аб тым, каб ужыць якія-небудзь меры, накіраваныя на палепшаньне гаспадарчага стану камуны.

Гэтымі днямі высьветлілася, што раённая спажывецкая кааперацыя ў часе адліву з камуны забрала 40 галоў рагатай жывёлы. Аднак, чамусьці гэтае стада лічыцца за камунай. Сяляне-аднаасобнікі, сярод іх ёсьць нават і заможныя, да гэтага часу карыстаюцца маемасьцю камуны. З іх чамусьці ніхто ня думае спагаяць кошт гэтай маемасьці.

Гэта ў той час, калі камуна знаходзіцца ў надзвычайна дрэнным гаспадарчым становішчы. Бухгальтэрыя праўленьня так заблытана, што трудна разабрацца. У сувязі з безгаспадарчасьцю і нездаровымі ўзаемаадносінамі з адзіноасобнікамі, палова засеянага ільну ў мінулую восень зусім сапсавалася. Ураджай ніяк не змалочан. З камунарамі разьбір ня зроблен.

Ня гледзячы на гэтыя цяжкасьці, камунары самааддана змагаюцца за поўнае выкананьне плянаў другой бальшавіцкай весны. Складаецца ўжо вытворчыя пляны, рамантуецца сельска-гаспадарчы інвэнтар і г. д. Камуна стаіць перад пагрозай недахопу насеньня для засеву наяўнай плошчы. Ячменю ня хопіць каля 2-х тон, ільна-насеньня — каля 7, аўса — каля 20 і г. д.

Прычыны становішча, у якім апынулася камуна, мы павінны шукаць у партыйным кіраўніцтве. І трэба сказаць, што адказнасьць цалкам кладзецца на апартуніста Гамзелева. Гамзелеў, будучы сакратаром ячэйкі камуны, дапусьціў грубае адміністраваньне ў мінулую весну, разлажыў парт'ячэйку камуны. Між іншым, ён чамусьці ўсё яшчэ застаецца на рабоце і наўтарае свае «лявацкія» перагібы, якія граюць на руку клясаваму ворагу.

Райком партыі павінен ужыць неадкладныя меры з тым, каб ня даць развалі́цца старэйшай у раёне камуне.

**Фарбэраў, Гарбачоў.**

# Бальшавіцкі згуртаваным

## СУСТРАКАЕ X-ю ГАДАВІНУ СВАЙГО ІСНАВАНЬНЯ ПАРТКАЛЕКТЫЎ Ф-КІ „КАСТРЫЧНІК“

### Яшчэ больш узмоцнена мабілізваць масы на змаганьне за генэральную лінію партыі, за высокія тэмпы работы на фабрыцы

## 10 год змаганьня

### *за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі*

Сёньня партарганізацыя фабрыкі «Кастрычнік» падагульвае сваю работу за 10 год на мабілізацыі рабочых швейнікаў на выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва. За 10-гадовы пэрыяд свайго існаваньня партарганізацыя фабрыкі правяла вялікую работу па стварэньні з дробных саматужных майстэрань буйнога прадпрыемства. Партарганізацыя на працягу ўсяго пэрыяду вяла жорсткае змаганьне за вызваленьне рабочых-швейнікаў з-пад уплыву рэштак контр-рэвалюцыйнай бундаўскай ідэалёгіі, якою была заражана частка рабочых нашай фабрыкі. І толькі на аснове жорсткага змаганьня за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі партколектыў дабіўся вялікіх посьпехаў у галіне папярэньня і ўмацаваньня фабрыкі. Аб гэтых посьпехах выразна паказваюць лічбы і факты.

З дробнай майстэрні ў 1921 годзе з колькасьцю 150 рабочых мы вырасьлі ў буйную сацыялістычную фабрыку, работа якое мэханізавана паводле апошняга слова тэхнікі. Зараз па фабрыцы налічваецца 1.836 чал. Фабрыка зьяўляецца кузьнай, дзе выкоўваюцца сапраўды новыя сацыялістычныя формы і мэтады працы. Сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам охоплена 1.330 чал. Ударніцтва зьяўляецца тэй рухаючай сілай энтузіязму рабочых, з якою яны вядуць змаганьне за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Вырасла налітычная актыўнасьць рабочых. На фабрыцы налічваецца каля 300 чалавек актыву. Стопроцэнтная падпіска рабочых на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады», **тысяча з лішкам чалавек, самазамацаваных на фабрыцы да канца пяцігодкі,—найлепшы довад актыўнасьці рабочых.**

Наш партколектыў у 1921 годзе налічваў у сваім складзе 5 чалавек. Зараз ён узрос у моцную бальшавіцка-стойкую арганізацыю з 380 чалавек. Яны з кожным годам папаўняюцца ўсё новымі і новымі лепшымі перадавымі пралетарамі-ударнікамі. Партарганізацыя фабрыкі дабілася вялікіх посьпехаў у справе палітычна-клясавага выхаваньня рабочых мас. Гэтыя посьпехі сталі магчымымі толькі таму, што партколектыў вёў бязьлітаснае змаганьне з усялякімі праяўленьнямі варожай пралетарыяту ідэалёгіі, за няўхільнае ажыцьцяўленьне ясніпінскай нацыянальнай палітыкі. Паступова інтэрнацыяналізуецца склад рабочых фабрыкі. Калі раней на фабрыцы працавалі амаль выключна яўрэі, зараз да моманту 10-годзьдзя налічваецца 585 рабочых іншых нацыянальнасьцяй, сярод якіх 476 беларусаў.

Гэтыя посьпехі здабыты ў жорсткай барацьбе за генэральную лінію партыі супроць контр-рэвалюцыйнага трацкізму, супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць усялякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі.

Перад партарганізацыяй фабрыкі ў сучасны момант стаць надзвычай вялікія і адказныя задачы. Першая з іх—гэта мабілізацыя мас на поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, на змаганьне супроць пралетэрыяту, на змаганьне супроць усялякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі.

Фабрыка бліскуча выканала прамфінплян за другі год пяцігодкі, за што была ўзнагароджана ордэнам чырвонага працоўнага сьцягу. Ва ўдарным квартале на фабрыцы адчувалася некаторае аслабленьне тэмпаў работы, у сувязі з чым былі выкананы заданьні на зьніжэньні сабекошту.

Прамфінплян за студзень месяц выканан на 94,6 проц., за люты—на 99,5 проц.

У часе падрыхтоўкі да юбілею партарганізацыі рабочыя далі цьвёрдае абяцаньне ліквідаваць прарывы першых двох месяцаў па працягу першай дэкады сакавіка. Гэта абяцаньне рабочыя фабрыкі выканалі з посьпехам. За 9 дзён сакавіка прамфінплян выкананы на 102 проц. Асобныя агрэгаты прамфінплян перавыканалі на 5-6 проц.

У адзнаку 10-ай гадавіны існаваньня партколектыву **арганізавана некалькі дзесяткаў новых ударных брыгад, ударных вучасткаў, рацыяналізатарскіх груп, якімі ахоплена 300-400 новых ударнікаў.**

**Больш як 100 лепшых ударнікаў—рабочых і работніц падалі заявы аб уступленьні ў ленінскую партыю.** Рабочыя ў сваіх заявах заяўляюць, што пад кіраўніцтвам і ў радах камуністычнай партыі будуць бязьлітасна змагацца з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, за бальшавіцкія тэмпы работы, за ніччо большае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. У калектыўных заявах, паданых у партколектыў, рабочыя заявілі аб тым, што тэмпы работы, якія былі ўзяты ўдарнікамі фабрыкі ў першай дэкадзе сакавіка, будуць утрыманы на працягу ўсяго трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Ударнікі заявілі, што ня толькі выканаюць, але і перавыканаюць сустрэчны прамфінплян.

## Новымі ўдарнымі брыгадамі,

### масавым уступленьнем у партыю

### рабочыя сустрэлі 10-годзьдзе свайго партколектыву

10-ю гадавіну існаваньня партарганізацыі фабрыкі «Кастрычнік» рабочыя сустрэлі павышэньнем сваёй актыўнасьці, ударнымі тэмпамі работы на ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну, якія былі ў першыя 2 месяцы бягучага кварталу.

Фабрыка бліскуча выканала прамфінплян за другі год пяцігодкі, за што была ўзнагароджана ордэнам чырвонага працоўнага сьцягу. Ва ўдарным квартале па фабрыцы адчувалася некаторае аслабленьне тэмпаў работы, у сувязі з чым былі выкананы заданьні на зьніжэньні сабекошту.

Прамфінплян за студзень месяц выканан на 94,6 проц., за люты—на 99,5 проц.

У часе падрыхтоўкі да юбілею партарганізацыі рабочыя далі цьвёрдае абяцаньне ліквідаваць прарывы першых двох месяцаў па працягу першай дэкады сакавіка. Гэта абяцаньне рабочыя фабрыкі выканалі з посьпехам. За 9 дзён сакавіка прамфінплян выкананы на 102 проц. Асобныя агрэгаты прамфінплян перавыканалі на 5-6 проц.

У адзнаку 10-ай гадавіны існаваньня партколектыву **арганізавана некалькі дзесяткаў новых ударных брыгад, ударных вучасткаў, рацыяналізатарскіх груп, якімі ахоплена 300-400 новых ударнікаў.**

**Больш як 100 лепшых ударнікаў—рабочых і работніц падалі заявы аб уступленьні ў ленінскую партыю.** Рабочыя ў сваіх заявах заяўляюць, што пад кіраўніцтвам і ў радах камуністычнай партыі будуць бязьлітасна змагацца з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, за бальшавіцкія тэмпы работы, за ніччо большае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. У калектыўных заявах, паданых у партколектыў, рабочыя заявілі аб тым, што тэмпы работы, якія былі ўзяты ўдарнікамі фабрыкі ў першай дэкадзе сакавіка, будуць утрыманы на працягу ўсяго трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Ударнікі заявілі, што ня толькі выканаюць, але і перавыканаюць сустрэчны прамфінплян.

## Партколектыву фабрыкі „Кастрычнік“ ад менгаркому КП(б)Б

**Менскі гарадзкі камітэт КП(б)Б горача вітае партколектыў і усіх рабочых чырвонасьцяжнай фабрыкі «Кастрычнік» з 10-годзьдзем існаваньня партарганізацыі фабрыкі.**

**Рабочыя «Кастрычніка», пад кіраўніцтвам свайго партколектыву, разам з рабочай клясай усяго СССР, вядучы рашучае змаганьне з рэшткамі контр-рэвалюцыйнай меншавіцка-бундаўскай ідэалёгіі, трацкізмам і правым апартунізмам — галоўнай небясьпекай на даным этапе — дабіліся буйных посьпехаў, вырасшы з невялічкіх расіданых саматужных майстэрань у буйнейшае прадпрыемства гораду.**

**Гэрвічнае змаганьне рабочых «Кастрычніка» за бальшавіцкія тэмпы работы, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады зрабілі вартымі іх вышэйшай і самай ганаровай узнагароды — ордэна чырвонага сьцягу.**

**Гарадзкі камітэт КП(б)Б упэўнен, што рабочыя «Кастрычніка», пад кіраўніцтвам свайго партколектыву, яшчэ вышэй узьнімуць сьцяг сацспаборніцтва і ўдарніцтва, яшчэ больш настойліва будуць змагацца за бальшавіцкія тэмпы работы, за якасьць прадукцыі, за поўнае аўладаньне тэхнікай, за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР.**

**РОХКІНД.**

## Ачышчаемся ад кулацкіх агентаў

Спэцыяльная камісія **Клімавіцкага РК КП(б)Б** абсьледавала становішча і работу Мікасевіцкай ячэйкі КП(б)Б. Камісія выявіла, што кіраўніцтва парт'ячэйкі ў асобе сакратара Баршчэўскага зраслося з кулацтвам. Баршчэўскі і старшыня праўленьня калгасу жылі на кватэры ў кулака Асмалоўскага. Гэта шырока карыстаў у сваіх інтарэсах кулак. Асмалоўскі, жэрці за ўсё ўцёрся ў давер'е праўленьня калгасу, сельсавету і парт'ячэйкі і лічыўся там «сваім» чалавекам.

Выкарыстоўваючы гэта, кулак Асмалоўскі арганізаваў накол сябе заможна-кулацкія элементы сельсавету і пачаў дзейнічаць. Сам Асмалоўскі зьяўляўся бухгальтарам калгасу, а бацька яго — вартаўніком. Гэта давала магчымасьць кулацкім элементам абкрадваць калгас, спэкулююць калгаснай маемасьцю (украдзена 6 пудоў масла, накрадзена сьвіньна і г. д.).

Член партыі, сенькор тав. Марчанка аб усім гэтым паведамляў сакратара парт'ячэйкі, але мясцкі замест таго, каб разганяць па кулацкую дзейнасьць, накіраваную на развал калгасу, узяў над сваю абарону кулака, а селькору прыгразіў выключэньнем з партыі.

Такія паводзіны сакратара парт'ячэйкі Баршчэўскага развязвалі рукі кулацкім элементам. Кулак Балотны, зьяўляючыся дастаўшчыкам фуражу і прадуктаў—сец калгасу, бескантрольна правоціў усялякія пакупкі, скарыстоўваў фураж для хаўчаваньня тэй жывёлы, якая знаходзіцца ў асабістым карыстаньні кулакоў. Сям'я кулакоў Сільчанкаў кіруе калгасным паравым млынам. Сільчанкавы разбазарылі 600 пудоў памольнага збору. У мыльне часта прападае і поўнае збожжа.

Адміністрацыя калгасу: старшыня праўленьня **Ніпіцін** і яго намесьнік **Гапайдзін**, бухгальтар Асмалоўскі маюць па дзве каровы, аўсім ня думаюць іх абагульваць і корміць калгасным фуражом. Гэта ў той час, калі калгаснага стада карміць нечым. У рэзультаце — дзве кароўы прапалі, заігнула шмат цялят і кала паўсотні нарасят. У мінулую ўборачную кампанію калгасам ня ўбрана 40 гэкт. сенажаці.

У калгасе 5 проц. агульнага складу — кулакі і заможныя.

Беднаты ў калгасе толькі 26 проц. Ёсьць некалькі батрацкіх сем'яў. Усю работу па дотлядзе жывёлы і паогул па гаспадарцы вядуць батракі і беднякі, фактычна яны служаць у кулакоў, якія кіруюць калгасам.

Ні толькі ў калгасе гаспадараў кулак. Яго рукі былі разьвязаны і на-за калгасам. Цьвёрдыя заданьні кулацкімі гаспадаркамі ня выконваліся і да іх ня прымаліся ніякія меры. Па ініцыятыве кулакоў, напрыклад, цьвёрдае заданьне кулакі выканалі толькі на 21 проц., па ніяцы — на 10 проц. і на бульбе — на 50 проц.

Як-жа рэагавала на такія зьявішчы парт'ячэйка? Як парт'ячэйка накіроўвала актыўнасьць беднаты на змаганьне супроць кулака?

Пра сакратара парт'ячэйкі Баршчэўскага і гаварыць ня прыходзіцца. Ён зрослся з кулакам, быў іх актыўным абаронцам. Член парт'ячэйкі Гарачоў запісаўся ў калгас. Але ён заставаўся жыць на аднаасобнай гаспадарцы свайго бацькі і ніякага ўдзелу ня прымаў у рабоце па замацаваньні калгасу. На працягу цэлых месяцаў парт'ячэйка ня зьбіралася на сходы. У палове сьнежня мінулага году сход парт'ячэйкі на пытаньні аб становішчы калгасу вылучыў тройку для складаньня рэзалюцыі. Яна яна была выпрацавана і да гэтага часу.

Махровая права-апартуністычная практыка ячэйкі давяла калгас да развалу. Падрыхтоўкі да весняной сяўбы не вялося ніякай. Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК аб кантрактацыі ні распрацоўвалася ні на парт'ячэйцы, ні на агульным сходзе калгасу.

Бюро райкому КП(б)Б панесла бязьлітасны ўдар кулацкай агентуры з Мікасевіцкай ячэйкі. Бюро райкому пастанавіла **Баршчэўскага выключыць з партыі і аб партыйнасьці іншых членаў бюро ячэйкі перадаць справу на разгляд раённай кантрольнай камісіі.** Кіруючыя работнікі калгасу і сельсавету адданы пад суд. Райком ужыў рад практычных мер, накіраваных на мабілізацыю батрацтва, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, на поўнае выкананьне плянаў бальшавіцкай сяўбы, на далейшае разгортваньне калектывізацыі.

**Б. Бэльзоўскі.**

## Як ячэйкі рыхтуюцца да сяўбы

### Па матар'ялах брыгадзіраў і рабселькораў

Забесьпячэньне пасьпяховага выкананьня дырэктывы партыі аб весняной пасеўнай кампаніі, арганічная ўвязка ўсёй работы і падпарадкаваньне яе асноўнай задачы арганізацыі новых калгасаў, масавага калгаснага прыліву патрабуе сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў работы кожнай раённай партыйнай арганізацыі, сэкцыі, калгасных і вясковых парт'ячэек.

Праверка выкананьня пастаноў аб пасеўнай кампаніі павінна стаць штодзённым мэтадам у рабоце кожнай парт'ячэйкі. Праведзеная дэкада праверкі падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі выявілася значным штуршком, мабілізуючым фактарам на ліквідацыі прарываў у гэтай справе, якія былі дапушчаны ў радзе раёнаў і сельсветаў.

Брыгадзір тав. **Радчанка, які прымаў** удзел у праверцы падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі ў **Койданаўскім раёне,** надае падзячны цікавы матар'ял па саўгасе «Негарэлае».

Амаль ніякай падрыхтоўчай работы да весняной сяўбы ў саўгасе не праводзілася да апошніх дзён лютага месяца. Не праводзілася малацьба і аўчыстка насеньня. Кіраўніцтва саўгасу не аддавала ніякай увагі рамонту інвэнтару і машын. Арганізацыя працы нікуды ня вартая, нават ня былі ўстаноўлены нормы выпрацоўкі і вызьдельшчыка. Аб сацспаборніцтве далей разважаньняў справа не пасунулася. Адсутнасьць работы з боку парт'ячэйкі па мабілізацыі рабочых на выкананьне задач пасеўнай кампаніі выклікаюць у некаторай часткі рабочых сумненьне ў магчымасьці выкананьня плянаў сяўбы саўгасам. Такія прарывы зьявіліся вынікам апартуністычных адносін кіраўніцтва саўгасу да важнейшай задачы. Варта было толькі па-бальшавіцку надыйсьці да справы, разгарнуць масавую работу і становішча рэзка зьмянілася.

З вялікім энтузіязмам адгукнуліся рабочыя саўгасу на адозву парт'ячэйкі аб ліквідацыі прарыву.

На сходзе вылучана брыгада з 5 дзённы тэрмін рамонту с.-г. інвэнтару і машын, наяўнасьці і патрэбнасьці змазачных і гаручай матэрыі. Таксама вылучаны брыгады для дапамогі ў падрыхтоўцы да сяўбы вакольным калгасам «Кастрычнік», «Бальшавік» і калгасу імя Войкава. 6 брыгад заняліся вярбоўкай рабочай сілы для малацьбы. Зараз малацьба ў саўгасе на поўным ходзе. Адначасова праводзіцца аўчыстка насеньня. Рабочыя і работніцы саўгасу абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Для ліквідацыі прарываў у падрыхтоўцы да сяўбы рабочыя пастанавілі арганізаваць суботнік, скарыстаўшы на гэта выхадны дзень.

Гэты энтузіязм рабочых зьяўляецца зарукай пасьпяховага выкананьня саўгасам плянаў сяўбы, калі парт'ячэйка будзе стаяць на чале гэтай актыўнасьці і накіроўваць яе на ліквідацыю тых прарываў, якія дапушчаны ў падрыхтоўчай рабоце.

Падрыхтоўка да пасеўнай кампаніі ў радзе раёнаў суправаджаецца масавым калгасным прыливам. Рост калектывізацыі зьяўляецца асноўным паказальнікам работы кожнай раённай партарганізацыі, не баяздольнасьці змагацца за новыя посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Арганізуючы новыя калгасы, трэба неадкладна завяршаць іх гаспадарчае афармленьне: абагульваць рабочую жывёлу, асноўныя сродкі вытворчасьці, стварыць сэмяну пасеньня фондаў, разгарнуць работу на падрыхтоўцы да сяўбы. Марудзіць у гэтай справе недапушчальна.

Брыгада **(Кантаровіч і Філановіч)** па праверцы ходу падрыхтоўкі да сяўбы ў **Клімавіцкім** раёне канстатуе значныя посьпехі гэтага раёну ў справе калектывізацыі.

З 1 студзеня па 10 лютага калгасны сэктар павялічыўся на 1.025 двароў. Паогул, у раёне калектывізавана 40,3 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Але з боку раённых устаноў, некаторых парт'ячэек і сельсветаў наглядаюцца недапушчальна нядбайныя адносіны да засьпіці пасеннага фондаў, ачысткі пасеньня, рамонту с.-г. інвэнтару і машын і раду іншых задач, зьвязаных з пасеўнай кампаніяй. Справа кантрактацыі не знайшла ніяко канкрэтнага правядзеньня ў жыцьцё на месцах. Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК папулярызавана недастаткова. Нічога канкрэтнага па яе рэалізацыі яе вызначана ні райкалгассаюзам, ні райкаапсаюзам. Канкрэтных плянаў кантрактацыі ў сельсаветах і калгасах яшчэ няма.

Аб ганебным адставаньні Вульскага раёну ў падрыхтоўцы да сяўбы паведамляе тав. Мікуцкі.

Падрыхтоўка да сяўбы праходзіць кепска. У калгасах пасеннымі фонды ссыпаюцца на разьліку плошчы мінулага году. Аўчыстка пасеньня і рамонт інвэнтару праводзіцца вельмі павольна. Прыліву ў калгасы зусім няма. У калгасах Гарбачэвіцкага сельсавету ёсьць некаторы адліў. Арганізацыйная практыка ў рабоце пасобных парт'ячэек не сустракае рашучага адпору. Работнікі раённага апарату за скажэньне партыйнай лініі на прыцяваюцца да адказнасьці, а толькі перамяшчаюцца на іншую работу.

Трывожны сыгнал падае наша брыгада (Кауфман, Навельская, Лабоўскі) з Уваравіцкага раёну.

У некаторых калгасах яшчэ не абмалочана збожжа яравых культур. Наглядаюцца тэндэнцыі да зьмяншэньня плянаў засеву тэхнічных культур. Парт'ячэйкі невыстарчальна праводзяць работу за новы калгасны прыліў.

Над гэтым раёнам шэфствуе рабочая арганізацыя фабрыкі «Камінтэрн». Пленум фабкому ўрачыста прыняў пастанову аб удзеле ў правядзеньні весняной пасеўнай кампаніі ў падшэфным раёне, але канкрэтнай дапамогі няма.

Такое становішча на месцах зьяўляецца недапушчальным. Час да пачатку сяўбы параўнальна нешырокі. Трэба рашуча біць на апартуністычных правых у адносінах да важнейшай задачы на падрыхтоўцы і правядзеньні весняной пасеўнай кампаніі.

# ПАД СЬЦЯГАМ ПЕРАМОГ

1.

Там, дзе зараз узвышаюцца карпусы **фабрыкі імя Крупскай**, год таму назад быў працалектыў беспрацоўных.

У працалектыве мяняліся работніцы кожныя 6 месяцаў. На фабрыку часамі прыязджалі былыя гандляры і дзеці вясковых кулакоў—чужакі імкніліся атрымаць званьне рабочых. Пэрыяд рэканструкцыі краіны патрабаваў пашырэньня фабрыкі. Рады фабрычнага калектыву папаўняліся новымі работніцамі.

Так паступова саматужная майстэрня ператварылася ў фабрыку. Ня стала працалектыву. Але рэшткі дробнабурасьніцкай ідэалёгіі, саматужных адносін да работы шмат у каго засталіся. Больш сарваць, а працаваць абы в рук —вось лейтматыў гэтай катэгорыі. На кіруючых пасадах фабрыкі, апынуліся апартуністы **Каждан,** сакратар парт'ячэйкі **Варанкоў.** Намесьнікам дырэктара зьяўляўся былы гандляр **Айзэрман.** Апартуністы імкніліся павялічыць пяцігодку на больш доўгі тэрмін.

Патрэбна была ўстраска фабрычнага жыцьця.

Апартуністычнае кіраўніцтва па патрабаваньні праз друк рабочых, было зьнята. Замест Каждана дырэктарам фаб

*Сакавік рашае посьпех кантрактацыі*

# УЗЯЦЬ БАЛЬШАВІЦКІ ТЭМП У РЭАЛІЗАЦЫІ АДОЗВЫ СНК І ЦК

## ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЯ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ РАДУ РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ТАРМОЗІЦЬ РАЗГОРТВАНЬНЕ КАНТРАКТАЦЫІ ЯРАВЫХ ПАСЕВАЎ

**Бязьлітасна руйнуючы супраціўленьне кулацтва і сабатаж з боку яго агентуры—апартуністаў забясьпечым бязумоўнае ажыцьцяўленьне гістарычнай адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі, даб'емся новага магутнага прыліву ў калгасы 100-процантным выкананьнем праграмы кантрактацыі яравых**

## ТАК ДА СЯЎБЫ НЯ РЫХТУЮЦЦА

Учора калегія Наркамзему заслухала даклады загадчыкаў 16 райза аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі і ходзе кантрактацыі.

З дакладамі выступілі прадстаўнікі ЛЕПЕЛЬСКАГА, БУДА - КАШАЛЕЎСКАГА, ЦЕРАХАЎСКАГА, РАСЬНЯНСКАГА, СЕНЬНЯНСКАГА, ЛАГОЙСКАГА, БЯГОМЛЬСКАГА, ВЕТКАЎСКАГА, ПУХАВІЦКАГА, ГЛУСКАГА і ІНШ. раёнаў.

Побач з раёнамі, дзе даякуючы шырокай растлумачальнай рабоце з беднатой ёсьць вялікія дасягненьні ў справе разгортваньня калектывізацыі, у радзе раёнаў пануе апартуністычная стаўка на самацёк і процант калектывізацыі ў гэтых раёнах вельмі нізкі. У той час, калі Лепельскі раён калектывізаваи ужо на 44 проц., Церахаўскі раён на 6 сакавіка калектывізаваи толькі на 13,1 проц., Расьнянскі—на 14,9 проц., Веткаўскі—на 15, Глускі—на 15,2 проц. і г. д.

Выступаўшыя таварышы адзначалі, што падрыхтоўка да пасеўнай кампаніі ў большасьці раёнаў яшчэ праходзіць самацёкам. Плян стварэньня насенных і страхавых фондаў у большасьці раёнаў выкананы толькі на 20-30 проц. Асабліва дрэнна праходзіць стварэньне страхавых фондаў у індывідуальным сэктары. У радзе раёнаў па індывідуальным сэктары на ссыпана ніводнага кілёграма ў страхавыя фонды. Ня лепшы маёнан і са збожжаачысткай. У той час, калі на калгасах большасьці раёнаў ачыстка збожжа поўнасьцю скончана, у індывідуальным сэктары плян збожжаачысткі выкананы толькі на 25-30 проц.

Загатоўка насеньня траў і гародных культур праходзіць злачынна марудна. У Лепельскім, Буда-Кашалёўскім, Расьнянскім, Крупскім і Глускім пляны загатовак выкананы ўсяго толькі ў сотых проценту.

Давядзеньне пасеўных плянаў да пасобных калгасаў і аднаасобных двароў таксама яшчэ далёка НЯ СКОНЧАНА. Абмен гатункова насеньня амаль ні ў адным раёне яшчэ НЕ РАСПАЧАТ.

Дрэнна таксама абстаіць справа з разгортваньнем рамонту с.-г. інвэнтару. Загадчыкі райза скардзіліся, што большасьць кузьняў ня мае чым рамантаваць с.-г. інвэнтар. У той-жа час яны нічога не сказалі, што зроблена раёнамі для мабілізацыі ўнутраных сродкаў, для збору лому, каб можна было правесьці рамонт с.-г. інвэнтару.

Абураючы факт бюракратычных адносін Белсельтрэсту да рамонту с.-г. інвэнтару падаў загадчык Лагойскага райза. Каля саўгасу Косіна з восені на полі ляжыць трактар, які патрабуе рамонту. Ня гледзячы на рад лістоў у Белсельтрэст аб тым, каб трактар быў забран у майстэрню для рамонту, ужо больш за 4 месяцы, як нельга дабіцца ніякага адказу.

У большасьці раёнаў склады райкаапсаюзу завалены с.-г. машынамі, рэалізацыя якіх праходзіць вельмі марудна. Такое-ж становішча і з мінэральнымі угнаеньнямі і вапнай.

Рэалізацыя трактарных абавязацельстваў Трактарацэнтру праходзіць вельмі МАРУДНА. Кантрольныя лічбы выкананы раёнамі на 5-10 проц.

Яшчэ горш разгортваецца работа па правядзеньні кантрактацыі. Большасьць раёнаў абмежавалася давядзеньнем плянаў да сельсаветаў. Аб далейшай рабоце, аб разгортваньні шырокай растлумачальнай кампаніі, аб заключэньні дагавораў пакуль што яшчэ ня думаюць. Затрымліваецца кантрактацыя і па віне цэнтральных арганізацый, якія да гэтага часу яшчэ не даслалі тыповых дагавораў.

Б.

## 1,8 проц. пляну

### Ільнаводчая каапэрацыя злачынна зрывае кантрактацыю яравых

### Патрабуем ад Белільнасаюзу рашучых мер

**Ільнаводчая каапэрацыя БССР агідна марудзіць в рэалізацыі адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі яравых пасеваў. Апошняя дзесяцідзёўка ня дала амаль ніякага эруху. На 5-га лютага закантрактавана ільну — 784 ГЭКТ. — 0,44 ПРОЦ. пляну, канапель — 44 ГЭКТ. — 0,48 ПРОЦ., яравых культур — 1.164 ГЭКТ. — 1,8 ПРОЦ. ПЛЯНУ.**

**Большасьць раёнаў фактычна ня прыступіла да кантрактацыі. Некаторыя райкаапсаюзы, як ВЕТРЫНСКІ, у мэтах самастрахоўкі прысылаюць у Белільнасаюз тэлеграмы аб тым, што на мясцох да гэтага часу не атрыманы пляны і тыповыя дагаворы кантрактацыі. Пры праверцы-ж аказалася, што гэтыя матар'ялы пасланы ў раёны яшчэ 25-га лютага.**

**Наркамснаб зусім ня ў курсе таго, як на мясцох праводзіцца кантрактацыя пасеваў. Толькі 35 раёнаў прыслалі весткі аб давядзеньні плянаў кантрактацыі да сельсаветаў. Але да рэалізацыі плянаў нават і ў гэтых раёнах НЯ ПРЫСТУПЛЕНА.**

**Наркамгандлю даў катэгарычнае ўказаньне аб абавязковай кантрактацыі ўсіх плошчаў, вызначаных плянамі. Ільнаводчыя раёны, якія засяюць вызначаны процант ільну, вызваляюцца ад кантрактацыі збожжа. Гэта павінна быць шырока выкарыстана ільнаводчымі раёнамі для поўнага забясьпячэньня ільнянога кліну ў іх раёнах.**

**Сёньня для ўзмацненьня тэмпаў кантрактацыі ў раёны выяжджаюць з Менску 50 адказных работнікаў Наркамснабу і яго аб'яднаньняў.**

## Не заготоўлена ніводнага кілё насеньня

Прасоўваньне маёнам у калгасы КРУГЛЯНСКАГА і АРШАНСКАГА раёнаў праходзіць вельмі марудна. За студзень і люты на Круглянскім раёне райкаапсаюз з 98 плугоў рэалізаваў толькі 8, з 160 барон... толькі 1, з 194 акучнікаў — 5 і г. д. Такі-ж маёнак і па Аршанскім раёне, дзе на 1 сакавіка рэшта с.-г. машын складае: плугоў — 83, барон — 206, акучнікаў — 292, пагольнікаў — 44, сартовак — 10, трыераў — 3, сеялак — 12 і г. д.

Райкаапсаюзы тлумачаць гэта тым, што высокі крэдытаваньне для калгасаў вялікі цяжкасьці: уцясьнае 50 проц. грашыма. Аднак, райкаапсаюзы нічога не зрабілі, каб узмацніць па калгасах мабілізацыю сродкаў. Работнікі Круглянскага райкалгасаюзу і райкаапсаюзу ня ведаюць, колькі машын патрэбна раёну да веснавой сяўбы.

Рэалізацыя адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі на Круглянскім і Аршанскім раёнах праходзіць нездавальняюча.

Пляны веснавой пасеўнай кампаніі яшчэ да гэтага часу не даведзены да ўсіх вёсак і паасобных двароў.

У рабоце раённых устаноў не адчуваецца набліжэньне веснавой кампаніі. На складах Аршанскага райкаапсаюзу ляжыць 200 тон мінэральных угнаеньняў. Райкаапсаюз ні прымае ніякіх мер, каб прасунуць угнаеньні ў калгасы. Сапная дарога не скарыстоўваецца. Замест 1.100 тон ваны, вызначаных плянам, завезены 572 тоны, што стварае пагрозу зрыву вапнаваньня глебы, бо вапну можна вывезьці пры наяўнасьці сапнай дарогі.

Дырэктыва партыі і ўраду аб стварэньні насенных страхавых фондаў і бранёваньні фуражных фондаў у калгасах выконваецца дрэнна.

ЯНОЎСКІ.

## У Віцебскім раёне КАНТРАКТАЦЫЯ ЗРЫВАЕЦЦА

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Райспажыўсаюз і райкаапсаюз праяўляюць ПОЎНУЮ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ у справе рэалізацыі адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі яравых пасеваў. Замест давядзеньня плянаў кантрактацыі садавагароднінны і іншых культур да калгасу і паасобнага двара, гэтыя пляны ўсё яшчэ ЗНАХОДЗЯЦЦА У СТАДЫІ «ПРАПРАЦОЎКІ». Райспажывецкае таварыства да гэтага часу не прыступіла да складаньня пляну кантрактацыі па індывідуальным сэктары. На працягу доўгага часу інспэктар гандлю насіў у кішэні кантрольныя лічбы Наркамзему і Наркамгандлю БССР па кантрактацыі. Ня выконваецца дырэктыва гарсавету аб кантрактацыі садоў па горадзе.

Трэба ўзяць пад грамадзкі кантроль выкананьне важнейшай дырэктывы партыі і ўраду аб кантрактацыі яравых 1931 году.

## МАЛА ДАВЕСЬЦІ ПЛЯН. ТРЭБА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ЯГО ВЫКАНАНЬНЕ

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Плян кантрактацыі даведзен РВК да кожнага сельсавету. Але многія сельсаветы да гэтага часу не прапрацавалі яго на прэзыдыумах і не давялі да кожнага калгасу, утворчага аб'яднаньня і кожнай вёскі.

Паасобныя сельсаветы, як Сястронскі, не разгарнулі ніякай масавай работы вакол правядзеньня кантрактацыі. Падрыхтоўка да веснавой кампаніі ня ўвязваецца з мерапрыемствамі па кантрактацыі.

Райком партыі паіраваў у раёны 19 адказных работнікаў, якім даручана мабілізаваць грамадзкую думку на практычнае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду аб кантрактацыі.

## ДА АДКАЗУ БЮРАКРАТАЎ З СЛУЦКАГА РАЙКААПСАЮЗУ

СЛУЦАК. (Наш кар.). Па Слуцкім раёне шырока разгарнулася практычная работа на кантрактацыі яравых пасеваў. Асноўныя пункты ўсіх сельсаветаў раёну пры прапрацоўцы адозвы пастанавілі закантрактаваць свае пасевы. Але райкаапсаюз, які павінен быў аформіць гэтыя пастановы, нічога не зрабіў і нават ні ведае, у якіх пунктах прынятыя пастановы аб кантрактацыі.

## НАВАТ ЯШЧЭ НЕ АБМЕРКАВАЛІ АДОЗВЫ

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Па Новасёлкаўскім сельсавеце да гэтага часу яшчэ ня прыступілі да папулярызацыі адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі. Ні адзін член сельсавету, акрамя старшыні, нагуя ня ведае, што такое кантрактацыя. Пытаньне аб кантрактацыі не абмяркоўвалася ні на прэзыдыуме, ні на пленуме сельсавету.

## НЕДАПУШЧАЛЬНАЯ МАРУДНАСЬЦЬ

БАБРУЙСК. (Наш кар.). З папулярызацыяй адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі пасеваў раённы зямельны аддзел надзвычайна спазьніўся, праявіўшы ў гэтых адносінах поўную непаваротлівасьць і бязьдзейнасьць. Пляны кантрактацыі яшчэ да гэтага часу не даведзены да большасьці сельсаветаў. Райза абмежавалася толькі рассылкай 10 дзён таму назад друкаванай адозвы. Адсутнічае кіраўніцтва нізавымі арганізацыямі. Такі-ж маёнак і па лініі спажывецкай каапэрацыі. Райспажыўсаюз да апошніх дзён ня ведаў, што і колькі ён павінен кантрактаваць.

# Зьмова маўчаньня


Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КАМУНАР МАГІЛЕЎШЧЫНЫ

Орган Магілеўскага РК КП(б)Б, ГВК і РПС.

№ 8 (1326) 1931 г.

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

РЭЧЫЦКАЯ ПРАЎДА

Орган Рэчыцкага РК КП(б)Б, Рэйвыканкому і Рэйпрофсавету.

Выходзе 8 сакавіка 1931 г. | № 21 (37)

ЧЫРВОНАЯ ПОЛАЧЧЫНА

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 57 (1326) | АЎТОРАК, 10-га сакавіка 1931 г.

Выходзіць гэ панядзелках, чацьвяргох і суботах


Непамерна вялізарная роля нашага друку ў справе рэалізацыі гістарычнай адозвы СНК і ЦК аб кантрактацыі.

Са дня апублікаваньня адозвы прайшло больш чым паўтара месяца. Тэрмін зусім выстарчальны, каб разгарнуць вакол адозвы СНК і ЦК найшырэйшую растлумачальную і арганізатарскую работу.

Мабілізаваць масы на бальшавіцкае выкананьне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам у адозьве аб кантрактацыі, упарта і настойліва са дня ў дзень змагаць за рэалізацыю гэтых задач,—адзін з найперавых і важнейшых абавязкаў кожнай газэты.

Ня ўсе, далёка ня ўсе нашы газэты выконваюць гэты абавязак. Яркім пацьвярджэньнем служыць агляд чатырох газэт, зьмешчаны ніжэй.

* * *

24 студзеня была апублікавана адозва СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб кантрактацыі. «Чырвоная Полаччына» да 31 студзеня абмінула гэты факт магільным маўчаньнем. Толькі 31 студзеня газэта загаварыла аб кантрактацыі. Пры гэтым рэдакцыя «Ч. П.» абмежавалася адным перадрукаваньнем перадавой са «Зьвязды». Аб тым, каб паставіць на ўсю вышыню пытаньне аб канкрэтным ажыцьцяўленьні адозвы на умовах Полацкага раёну, «Чырвоная Полаччына» «не падумала».

Затым матар'ялы аб кантрактацыі зусім зьніклі са старонак газэты. Пасьля 31 студзеня газэта систэматычна давала рад баявых апэрацыйных падбораў аб падрыхтоўцы раёну да другой калгаснай вясны, але ў іх ні было, літаральна, ні аднаго слова аб кантрактацыі. «Чырвоная Полаччына» стала на памылковы шлях, механічна адкладваўшы выкананьне задач па кантрактацыі ад падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Напрыклад, 2 лютага газэта дала цэлую паласу аб падрыхтоўцы да сяўбы і арганізацыі новага калгаснага прыліву. Аднак, дарэмна шукаць у гэтай паласе хаця-б адзін радок, прысьвечаны кантрактацыі. Як быццам-бы кантрактацыя ў раёне зусім не праводзіцца, як быццам кантрактацыя не зьяўляецца вузлавой і арганічнай задачай падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны.

І гэта памылка штампавалася газэтай ня толькі ў падборках, прысьвечаных веснавой пасеўнай кампаніі, але і ў кіруючых рэдакцыйных артыкулах. 12 лютага газэта зьмясьціла перадавую аб выніках раённага зьезду савэтаў, у якой завастрыла ўвагу на чарговых задачах калгаснага руху і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Але з гэтых чарговых задач зусім выпала пытаньне аб кантрактацыі, быццам Полацкі раён не павінен змагацца за ажыцьцяўленьне адозвы СНК і ЦК.

15-га лютага ў чарговай паласе аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі «Чырвоная Полаччына» зноў ні адным словам не ўспамінае пра кантрактацыю. Аб тым, як у раёне выконваецца адозва СНК і ЦК «Чырвоная Полаччына» да 15 лютага не зьмясьціла ні аднаго радка. 17 лютага ў чарговым нумары газэта зьмяшчае вялікую падборку аб падрыхтоўцы да сяўбы і зноў учэпваецца ні аднаго слова не сказаць аб выкананьні адозвы СНК і ЦК. У наступных трох нумарох да 27 лютага газэта, як і раней, захоўвае магільнае маўчаньне аб кантрактацыі.

Толькі 2 сакавіка (№ 24) у «Чырвонай Полаччыне» зьявілася невялікая падборка пад аншлягам:

— Кантрактацыя яравых пасеваў — важнейшае палітычнае і гаспадарчае мерапрыемства.

За гэтым аншлягам ідзе невялічкі артыкул, у якім няма ні слова аб канкрэтным становішчы справы, затое многа апартуністычнага самаўспакаеньня.

«Па ўсіх сельсаветах праводзіцца шырокая растлумачальная кампанія сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. Гэта работа ўвязваецца з практычным заключэньнем дагавораў на кантрактацыйныя культуры».

Такім чынам, паводле артыкулу ўсё стаіць добра. Праводзіцца шырокая растлумачальная работа, якая ўвязваецца з практычным заключэньнем дагавораў на кантрактацыі і г. д. Але ніжэй рэдакцыя, у тым-жа артыкуле, пярэчыць сама сабе. У канцы артыкулу чытаем:

«Трэба адзначыць, што яшчэ ня ўсе сельсаветы патрабным чынам разгарнулі шырокую растлумачальную работу вакол правядзеньня кантрактацыі. У некаторых сельсаветах растлумачальная работа ня ўвязваецца з практычным заключэньнем дагавораў».

На гэтым артыкуліку «Чырвоная Полаччына» паставіла крыжык. Зьмяшчаючы 4 сакавіка вялікі артыкул аб падрыхтоўцы 3-х сельсаветаў да веснавой посьпеўнай кампаніі, газэта зноў забывае хоць што-небудзь сказаць аб ходзе кантрактацыі. Праўда, у гэтымжа нумары зьмешчана заметка «Растлумачыць выгады кантрактацыі для калгасьнікаў», але яна складаецца ад радка да радка толькі з адных агульных разважаньняў. Ні аднаго канкрэтнага факту няма.

У апошнім, прагледжаным намі, нумары «Ч. П.» (ад 7 сакавіка) мы дарэмна прабавалі знайсьці хаця-б адну заметку аб тым, як у раёне праходзіць кантрактацыя, як выконваецца адозва СНК і ЦК.

Вывад — «Чырвоная Полаччына» праяўляе апартуністычную недаацэнку вялізарнага значэньня кантрактацыі і, у прыватнасьці, адозвы СНК і ЦК. Газэта пальцам не паварушыла, каб мабілізаваць масы на выкананьне адозвы, каб забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне ў раёне пляну кантрактацыі.

На гэтым адказьнейшым участку барацьбы за сацыялістычную рэканструкцыю вёскі «Чырвоная Полаччына» пляцецца ў найгыбейшым тыпу.

* * *

«Камунар Магілеўшчыны» пайшоў па шляху «Чырвонай Полаччыны». За люты газэта не зьмясьціла амаль ні адной падборкі аб ходзе кантрактацыі на раёне. Матар'ял аб кантрактацыі, зьмешчаны на старонках «Камунара» за тэты перыяд, носіць павярхоўны, рэгістрацыйны, агульны характар.

Як і «Чырвоная Полаччына», «Камунар Магілеўшчыны» ў сваіх рэдакцыйных артыкулах аб калектывізацыі і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы не завастрае ўвагі на кантрактацыі. Напрыклад, перадавая «Камунара» да зьезду савэтаў «На гістарычным перавале» (нумар ад 6 лютага) многа трактуе аб задачах далейшай барацьбы за калгасны прыліў і галавую падрыхтоўку да другой калгаснай вясны, але ні адным радком не ўспамінае пра кантрактацыю.

Толькі 13 лютага «Камунар Магілеўшчыны» загаварыў аб гэтым пытаньні. Над паласой, прысьвечанай падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, газэта дала гучны аншлаг:

— «Кантрактацыя — баявая праграма сацыялістычнага наступленьня ў вёсцы».

У паласе-ж... няма ні адной заметкі аб кантрактацыі. Толькі ў рэдакцыйнай перадавой аб падрыхтоўцы да сяўбы аб кантрактацыі сказана, літаральна, пекалькі слоў, а іменна, што ні райкаапсаюз, ні райкаапсаюз ня ведаюць, як выконваецца ў раёне адозва СНК і ЦК. І гэта ўсё. Выходзіць, што ні толькі раённыя арганізацыі, але і сама газэта ня мае ніякага ўяўленьня аб тым, як Магілеўскі раён выконвае адозву партыі і ўраду аб кантрактацыі.

Да 8 сакавіка «Камунар «Магілеўшчыны» зьмясьціў усяго некалькі невялікіх заметак аб тым, што паасобныя перадавыя калгасы і вёскі пастанавілі поўнасьцю закантрактаваць свае яравыя пасевы. Але гэтыя факты газэта падала проста як звычайную хроніку. І гэта замест таго, каб на прыкладзе перадавых калгасаў пацягнуць адстаючых, каб вопыт лепшых перанесьці ва ўсе сельсаветы, калгасы і вёскі раёну. Разгорнутага-ж матар'яду аб тым, як праходзіць кантрактацыя ў раёне, газэта так і не дала.

* * *

Адозва СНК і ЦК аб кантрактацыі непасрэдна датычыла і камсамольскіх арганізацый. Тым больш, «Чырвоная Зьмена»—ЦО камсамолу Беларусі, павінна была з сапраўднай камсамольскай энэргіяй мабілізаваць камсамольскую арганізацію на барацьбу за ажыцьцяўленьне адозвы партыі і ўраду. Павінна, але не зрабіла.

Да 15 лютага «Чырвоная Зьмена» наогул не зьмясьціла ніякага матар'ялу аб кантрактацыі, абмежаваўшыся апублікаваньнем адозвы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) і СНК БССР і ЦК КП(б)Б.

Толькі ў нумары ад 15 лютага газэта дала невялікі матар'ял «лёгкай кавалерыі» аб тым, як цэнтральныя установы рэалізуюць адозву СНК і ЦК аб кантрактацыі.

Але вось дзіўна. Газэта піша аб тым, як рэалізуюць адозву Наркамзем, прафсаюзы і г. д. (патрэбная, каштоўная і карысная справа), але чамусьці ні слова не гаворыць, як рэалізуюць адозву камсамольскія камітэты, камсамольскія арганізацыі. Да 15 лютага «Чырвоная Зьмена» ні слова ня пісала аб гэтым, а, значыць, у самы адказны момант не праводзіла мабілізацыі камсамольскіх мас на барацьбу за ажыцьцяўленьне адозвы партыі і ўраду.

16 лютага над паласой, прысьвечанай падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны, «Чырвоная Зьмена» дае «шапку»:

«ШЫРЭЙ РАЗМАХ, ВЫШЭЙ ТЭМПЫ!

Да канца лютага пляны кантрактацыі і падрыхтоўкі да сяўбы павінны быць выкананы».

Але ў паласе няма нічога канкрэтнага аб задачах барацьбы за ажыцьцяўленьне адозвы СНК і ЦК, ні адным радком ня ўспомніла пра кантрактацыю.

6 сакавіка ў перадавой «На подступах да вясны» «Чырвоная Зьмена» паўтарыла гэту памылку. У гэтым артыкуле зноў няма ні аднаго слова аб кантрактацыі.

«Чырвоная Зьмена» павінна рашуча перабудавацца і мабілізаваць камсамольскія масы на сапраўдную барацьбу за рэалізацыю адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі.

* * *

«Рэчыцкая Праўда» мае бясспрэчныя заслугі ў барацьбе за арганізацыю новага калгаснага прыліву. Але гэтыя заслугі значна зьмяншаюцца тым, што газэта не разгарнула бальшавіцкай барацьбы за рэалізацыю адозвы СНК і ЦК аб кантрактацыі. Газэта да 10 лютага ў сваіх артыкулах і падборках пакуль нічога не сказала аб ходзе кантрактацыі на раёне і нават не апублікавала адозвы СНК і ЦК.

Толькі 13 лютага газэта ўспомніла аб кантрактацыі і выступіла з вялікім аншлягам на цэлую паласу:

«Пастанова СНК і ЦК УсеКП(б) аб кантрактацыі яравых пасеваў і да гэтага часу не растлумачана калгасьнікам і аднаасобнікам».

Але гэты аншлаг рэдакцыя «Рэчыцкай Праўды» не пацьвердзіла ніякім канкрэтным матар'ялам, абмежаваўшыся зьмяшчэньнем агульнага артыкулу аб задачах кантрактацыі. Гэтыя самыя канкрэтныя матар'ялы аб ходзе кантрактацыі па Рэчыцкім раёне ня ўбачылі сьвету і ў далейшым на працягу ўсяго лютага, за выключэньнем адной пастановы РК КП(б)Б аб кантрактацыі, апублікаванай у газэце.

* * *

Сакавік — пачаўшы месяц у выкананьні праграмы кантрактацыі. Да красавіка засталося лічаныя дні. Друк павінен мабілізаваць усе свае сілы, неадкладна разгарнуць самую шырокую работу вакол рэалізацыі адозвы СНК і ЦК, разгарнуць бальшавіцкую барацьбу за сваячасовае заключэньне кантрактацыйных дагавораў, кінуць усе сілы на выкананьне гэтых задач.

У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ГЭТА ПАВІННЫ ЗРАБІЦЬ АДЗНАЧАНЫЯ Ў НАШЫМ АГЛЯДЗЕ ГАЗЭТЫ.

М.

# Камінтэрн і змаганьне з меншавізмам

12 год таму назад у пачатку сакавіка (2-6) адбыўся першы кангрэс III Камуністычнага Інтэрнацыяналу, пад сьцягам якога з таго часу ўсё мацней і шырэй разгортваюцца клясавыя бі сусьветнага пралетарыяту. 12 год таму назад на першым кангрэсе сярод нясумненных староннікаў пралетарскай рэвалюцыі, якімі былі прадстаўнікі маладой камуністычнай партыі Гэрманіі, раздаваліся яшчэ галасы аб сваячасовасьці заснаваньня Камінтэрну. Кангрэс адкінуў гэтыя сумненьні тав. Эберлейна. Кангрэс стаў рашуча на шлях заснаваньня баявой міжнароднай арганізацыі рабочай клясы, даў штуршок заснаваньню камуністычных партый на ўсім сьвеце, паставіў перад сусьветным пралетарыятам асноўную задачу эпохі — арганізаванае змаганьне мас за дыктатуру пралетарыяту ў форме савэтаў. У гэтым заключаецца яго гістарычная заслуга. Ленін, даючы ацэнку работам кангрэсу на заключным засяданьні яго, цьверда заявіў: «Перамога пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце забясьпечана. Паступае заснаваньне міжнароднай савецкай рэспублікі».

Шэр прымусіла прадстаўніка аднаго з найбольш моцных атрадаў сусьветнага камуністычнага руху — прадстаўніка гэрманскай партыі — выказаць сумненьні адносна сваячасовасьці заснаваньня Камінтэрну? — Рабочыя масы не разумеюць неабходнасьці заснаваньня нового Інтэрнацыяналу — такі мавіў быў в боку делегата Гэрманіі тав. Эберлейна. Раскол у адзінай калісьці кіруючай партыі II Інтэрнацыяналу даўно ужо стаў фактам, аднак, традыцыі адзінства на працягу доўгага яшчэ часу прайкалі і затрымлівалі канчаткоў разрыў з апартуністамі нават сярод тых, якія лічылі гэрманскую сацыял-дэмакратыю зараз-жа пасьля гістарычнай здрады 4 жніўня 1914 году проста «сьмярдзячым трупам» (Р. Люксэмбург).

Зараз-жа пасьля гэтай ганебнай здрады быў высунут Леніным лёзунг стварэньня III Інтэрнацыяналу. «II Інтэрнацыянал памёр, пераможаны апартуністамі. Далоў апартунізм, і ніхай жыве ачышчаны ня толькі ад «перабежчыкаў», але і ад апартунізму III Інтэрнацыянал», — пісаў Ленін і лістанала 1914 году. Але патрабавалася амаль 5 гадоў далейшага разьвіцьця і паглыбленьня распачатага вайной усеагульнага крызісу капіталізму, трэба было, каб Кастрычніцкая рэвалюцыя распачала міжнародную рэвалюцыю пралетарыяту, трэба было вялізарнага пад'ёму рэвалюцыйнага руху ва ўсіх капіталістычных краёх для таго, каб быў створан Камуністычны Інтэрнацыянал, які паставіў задачу «барацьбы за сусьветную дыктатуру пралетарыяту, за сусьветны камунізм».

Акрэсьліваючы «месца III Інтэрнацыяналу ў гісторыі», У. І. Ленін зараз-жа пасьля першага кангрэсу пісаў: «І Інтэрнацыянал залажыў фундамант пралетарскай міжнароднай барацьбы за сацыялізм. II Інтэрнацыянал быў эпохай падрыхтоўкі глебы для шырокага масавага пашырэньня руху ў радзе краёў. III Інтэрнацыянал успрыняў плады работ II Інтэрнацыяналу, вдзек яго апартуністычную, сацыял-шавіністычную, буржуазную і дробна-буржуазную дрэнь і пачаў ажыцьцяўляць дыктатуру пралетарыяту».

У гэтым заключаецца вялізарнае сусьветна-гістарычнае значэньне Камінтэрну. Ажыцьцяўленьне сусьветнай пралетарскай дыктатуры зьяўляецца задачай нашай гістарычнай эпохі. Камінтэрн праз 12 год вырас у магутную сусьветную арганізацію, у якую ўваходзіць 59 кампартый розных краін усіх 5 часьцей сьвету. Пад кіраўніцтвам Камінтэрну вядуць барацьбу мільёны пралетараў і працоўнага сялянства. Камінтэрн зьяўляецца кіраўніком нацыянальна-вызваленчага руху соцень мільёнаў прыгнечаных рабоў імпэрыялізму ў калёніях і поўкалёніях.

Упартае і цяжкае змаганьне вядуць мільёны рабочых і прыгнечаных масы калёній пад кіраўніцтвам кампартый з буржуазіяй. Капіталістычная гаспадарка, якая некалькі апраявілася ад пасьляваеннага крызісу, зноў уступіла ў новы, раней нябачаны, усеагульны крызіс. Прадбачаньні Камінтэрнам сунярэчнасьці капіталістычнай сыстэмы абвастраюцца з кожным днём. У сотнях дробных схватак, у дэманстрацыях і забастоўках, у радзе буйных палітычных кампаній зьбіраюцца і рыхтуюцца сілы пралетарыяту для зьвяржэньня капіталізму, для ўстанаўленьня дыктатуры пралетарыяту.

Але на шляху да пралетарскай рэвалюцыі і да нацыянальнага вызваленьня прыгнечаных калёній і поўкалёній стаіць ня толькі згуртаваная, і узброеная клясa капіталістаў. «Апартуністычная, сацыял-шавіністычная, буржуазная і дробна-буржуазная дрэнь»—сацыял-дэмакратыя, якая з'арганізавалася ў II пасьляваенным Інтэрнацыянале, стала буржуазнай рабочай партыяй, зьяўляецца самым роздным ворагам дыктатуры пралетарыяту.

Усё, што раней было рэвалюцыйнага, клясавa сьвядомага ў II Інтэрнацыянале, пасьля вайны ўступіла ў камуністычную партыю. Усё, што было шавіністычнага, буржуазнага і дробна - буржуазнага, імпэрыялістычнага, —з'арганізавалася ў II Інтэрнацыянале. Выкарыстоўваючы вельмі спрытна ўсе заслугі перад рабочай клясай у мінулым, ужываючы вельмі шырока дэмагогію, маючы ў сваіх руках магутны бюракратычны апарат прафсаюзаў, апіраючыся на ленш аплачаную верхавінку, з аднаго боку, на клясава маласьвядомую часьць пралетарыяту і на дробную буржуазію—з другога,—сацыял-дэмакратыя зьяўляецца самым шкодным агентам ворага ў радох змагаючагася за сваю дыктатуру пралетарыяту.

Апошнія гады з найвялікшай выразнасьцю выявілі значэньне і ролю сацыял-дэмакратыі, як буйной контр-рэвалюцыйнай сілы. Не дарма праграма Камінтэрну акрэсьліла ролю сацыял-дэмакратыі ў змаганьні за дыктатуру пралетарыяту, як буйнейшай контр-рэвалюцыйнай сілы—апоры капіталізму: «Асноўная роля сацыял-дэмакратыі заключаецца цяпер у падрываньні неабходнай баявой еднасьці пралетарыяту ў яго змаганьні з імпэрыялізмам. Рашчапляючы і раскладаючы адзіны фронт пралетарскага змаганьня з капіталам, сацыял-дэмакратыя зьяўляецца галоўнаю апорaю імпэрыялізму ў рабочай клясе. Міжнародная сацыял-дэмакратыя ўсіх адценьняў, II Інтэрнацыянал і яго прафэсыянальны філіяльны аддзел, Амстэрдамскае аб'яднаньне прафсаюзаў сталі, такім чынам, разэрвам буржуазнага грамадзтва, яго найбольш вернаю апорaю».

Неабходнасьць вядзеньня самага рашучага змаганьня з гэтай «вернай апорай» капіталізму вынікае яшчэ і з таго, што сацыял-дэмакратыя адначасова зьяўляецца найбольш ліцемернай і дурыцкай сілай. Аб гэтым праграма Камінтэрну піша: «абалуроўваючы інтарэсы буржуазіі сярод рабочае клясы і стоячы палкам на грунце клясагага супрацоўніцтва і каліцыі з буржуазіяй, сацыял-дэмакратыя бывае ў поўным пэрыяды вымушана пераходзіць на становішча апазыцыйнае партыі і нават сьцімулявацьь абарону клясавых інтарэсаў пралетарыяту ў яго эканамічным змаганьні толькі для таго, каб, заваёўваючы на гэтым давер'е часткі рабочае клясы, тым больш ганебна здрадзіваць яго сталым інтарэсам, асабліва ў часе рашаючых клясавых баёў».

Для больш моцнага ўплыву на рабочую клясу, для забясьпячэньня сваёй контр-рэвалюцыйнай палітыкі ў масах сацыял-дэмакратыя «апэрує двума сваімі крыламі». Правае крыло служыць для непасрэднай сувязі з буржуазіяй і выкананьня яе заданьняў, «леве»—для гульні ў апазыцыю, для найбольш тонкага абману рабочых, для замацаваньня сваёй здрадніцкай ролі агента буржуазіі ў арміі змагаючагася пралетарыяту.

Буржуазія вельмі добра зразумела карысьць паслуг II Інтэрнацыяналу. Буржуазія добра аплачвае прадстаўнікоў II Інтэрнацыяналу за іх паслугі. Працэс «саюзнага бюро» меншавікоў ускрыў з выстарчальнай яснасьцю на толькі шкодніцкую работу, накіраваную на падрыхтоўку інтэрвэнцыі з боку меншавікоў. Гэты працэс з вялікай выразнасьцю пацьвердзіў факт удзелу в падрыхтоўцы інтэрвэнцыі ўсяго II Інтэрнацыяналу, факт правядзеньня меншавікамі падрыўной работы у СССР на сродкі як беларэмігранцкай буржуазіі разам з штабамі імпэрыялістычных дзяржаў, так і на сродкі кіруючых партый II Інтэрнацыяналу.

І гэта для II Інтэрнацыяналу—гэтага штабу сусьветнага меншавізму—не зьяўляецца выпадковым.

Перамога вялікага пляну сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР канчаткова нібівае апору з-пад II Інтэрнацыяналу. Росквіт СССР і заняпад усёй капіталістычнай сыстэмы, пад'ём масавага рэвалюцыйнага руху ўсё больш памяншаюць уплыў сацыял - дэмакратыі сярод рабочых. Армія рэвалюцыі быстра ўзрастае. Сацыяльная апора меншавізму перасоўваецца ад рабочых да буржуазіі, а значыцца паменшаецца, слабее. Таму з такою злобаю агрызаецца II Інтэрнацыянал на СССР. Яму застаецца апошні сродак для звароту перамогі капіталістычнай сыстэмы—шляхам інтэрвэнцыі раздушыць СССР.

У II Інтэрнацыяналу ёсьць вялікая практыка. Трэба ўспомніць толькі крывавыя ўчынкі Носке, які сам аб сабе гаварыў на пэйманскім з

# Больш паловы загатоўленага лесу НЯ ВЫВЕЗЕНА

## Арганізацыі Лесбелу не падрыхтаваны да сплаву

*Да канца саннага шляху поўнасьцю вывезьці ўсе лесаматар'ялы!*

### УСЯ СПРАЗА--ВА УМЕНЬНІ МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ

**Няма „аб'ектыўных прычын—ёсьць дрэнныя работнікі"**

СНК заслухаў даклад Лесбелу аб ходзе лесазагатовак і лесавываз.

На 1 сакавіка плян загатовак першага кварталу на дзелавой драўніне выкананы на 70,1 проц., а па дрывах—24 проц. Вывазка будаўнічых матар'ялаў—35 проц.; а дроў—34,2 проц.

Такім чынам, дзякуючы накіраванню галоўнай увагі на загатоўку дзелавой драўніны, у гэтай галіне наглядаецца нескаторы зрух. Затое надзвычай адстае загатоўка дроў, вялікі прарыў у галіне вывазкі матар'ялаў.

Толькі апартуністычная бязьдзейнасьць можна тлумачыць нізкія тэмпы вывазкі.

Тав. **Сьвірыдаў** прывёў прыклады, якія сьведчаць, што там, дзе работнікі райвыканкому і апарату Лесбелу, урэшце, зразумелі, што аб'ектыўных прычын ня існуе, што ўся справа — ва меньшы і жаданьні працаваць, у мабілізацыі мас, у напружаньні сіл, там ёсьць відавочны пералом. Так, Рэчыцкі раён, які ўвесь час на вывазцы цягнуўся ў хвосьце, зараз выканаў 45 проц. пляну, Аршанскі—41 проц., Гомельскі—53 проц., Калінкавіцкі—57 проц.

Адстаюць, як і раней, Быхаўскі, Барысаўскі, Жлобінскі і інш. раёны.

Слабы ўдзел у лесазагатоўках і вывазцы прымаюць калгасы.

Камсамольская арганізацыя яшчэ не мабілізавалася ў належнай меры на гэту кампанію. З 1.000 мабілізаваных камсамольцаў працуе на загатоўках толькі 240. У Асіпавіцкім раёне, дзе паслана 30 чалавек, працуе толькі адзін.

Лесазагатоўчыя арганізацыі стаяць у баку ад арганізацыі загатовак, лічачы гэта не сваёй справай, а справай савецкіх органаў.

Тав. **Рыжоў** спецыяльна закрануў пытаньне аб апараце лесгамгасаў. Апарат засмечан былымі жандарамі, чыноўнікамі, гандлярамі, былымі лесапрамысловцамі; зусім зразумела, што такі апарат не запікаўлен у посьпеху загатовак, а наадварот імкнецца тармазіць іх. Тав. Рыжоў прыводзіў факты ўпёртага шкодніцтва з боку работнікаў лесгамгасаў, калі ў добрае падвор'е драўніну ня вывозяць, а наўмысьля вывозяць у дрэнпае, чым пагоршваецца ле якасьць.

**Трэба мабілізаваць усе сілы на выкананьне праграмы загатовак і вывазкі.** Асаблівы ўпор павінен быць зроблен на **вывазцы.** Неабходна таксама дабіцца рашучага пералому ў загатоўцы дроў.

СНК настаяваў праверыць, як выкананы даныя раней дырэктывы РВК і лесгамгасам. Адпачасова СНК усклаў персанальную адказнасьць за ход дрэвазагатовак і вывазкі на старшынь райвыканкомаў і дырэктароў лесгамгасаў. НК Гандлю, Саюзхлебу і Лесбелу даручана дабіцца адгрузкі аўса з Зах. вобласьці і Украіны на ўжо выданых парадах.

Упаўнаважаныя ЦК і СНК павінны на працягу бліжэйшай дэкады арабіць праверку выкананьня дырэктыў з боку райвыканкомаў і лесгамгасаў.

### Недаацэнка кампаніі пагражае зрывам заданьня

ПАШНІКІ. (Наш кар.). Тэмпы лесазагатовак усё яшчэ нізкі. У лесе ляжыць звыш 6.000 кубаметраў лесаматар'ялу, што складае 70 проц. заданьня па загатоўках; вывезена толькі 3.250 кбм—37 проц. праграмы.

Было дана заданьне загатовіць 1.185 кбм, экспарэнты матар'ялу, загатоўлена-ж толькі 160. З 6 тыс. кбм. дроў, якія трэба было вывезьці з лесу, вывезена 1.860, што складае 31 проц. **Цьвёрдыя заданьні не даведзены поўнасьцю да кулацкіх дваёў.**

Райком КП(б)В і РВК ня прымаюць энэргічных мер, каб актывізаваць работу, каб поўнасьцю выканаць пляны. На пленуме РВК было настаўлена пытаньне аб лесазагатоўках, але, наводле прапановы райкому, пытаньне было зьнята. Гэта ёсьць недаацэнка кампаніі лесазагатовак, якая пагражае зрывам выкананьня дырэктыў партыі і ўраду.

Вучлесгамгас спадзяецца на райком і райвыканком і сам ніякай працы не праводзіць. Нічога ня зроблена, каб разгарнуць сацыябаронніцтва і ўдарництва паміж брыгадамі лесарубаў.

З—ў.

### Забясьпечыць апалам заводы Барысаўшчыны

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Лічбы выкананьня пляну лесазагатовак: 60 проц. па будаўнічых матар'ялах, 24 проц.—па дрывах, 22,3 проц.—па вывазцы лесаматар'ялаў, 50 проц.—па вывазцы дроў,—гаворыць за тое, што ніякага пералому ў рабоце лесгамгасу няма. У лютым барысаўскія фабрыкі і заводы (макаронная фабрыка імя Леніна, «Прафінтэрн», лесазаводы) мелі рад прастояў з-за недахвату апалу. Вучлесгамгас не перадаваў свае работы ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі трэцяга рашаючага году і не паклапаціўся забясьпечыць прадпрыемствы апалам і лесаматар'ялам.

Дырэктар лесгамгасу тав. **Лубнеўскі** ня ведае, што робіцца на вучастку, бо ні разу не выяжджаў на раён.

Вучлесгамгас атрымаў заданьне забясьпечыць завод «Камінтэрн» сырцом. Гэта заданьне ня выканана, бо, наводле думкі тав. Лубнеўскага, яно «перазьлае». Такое апартуністычнае тлумачэньне гаворыць за тое, што кіраўнікі лесгамгасу пралёўляюць яўную недаацэнку кампаніі лесазагатовак.

НЭЙДЛІН.

### Чырвоныя абозы з лесам

ХАЛОПЕНІЧЫ (НАШ КАР.). КАЛГАСЬНІКІ, ВЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ—АДНАСОВІКІ, КАШЧЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, АРГАНІЗАВАЛІ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ З ЛЕСАМ. НЕКАЛЬКІ ДЗЕСЯТКАЎ ФУРМАНАК ДАСТАВІЛІ БУДАЎНІЧЫ МАТАР'ЯЛ І ДРОВЫ. «ЛЕСНАЙ ПАДАРУНАК УСЕБЕЛАРУСКАМУ ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ І РАБОЧЫМ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР, ЯКІЯ БУДУЮЦЬ САЦЫЯЛІЗМ», — ЗАЯВІЛІ УДЗЕЛЬНІКІ ЧЫРВОНЫХ АБОЗАЎ.

АЛІМОР.

### *РСІ, зірні на прыстань Пхоў!*

**ПХОЎ. (Па тэлеграфу).** На прыстані Пхоў, за 4 кілёмэтры ад Мазыра, ны рацэ Прыпяці даўно ляжыць некалькі соцень кубамэтраў асінавага бярвеньня—сырцу для выробу запалак і дубовых стоек, вельмі патрэбных Данбасу.

Гэты каштоўнейшы лесаматар'ял нікуды не адгружаецца. З першым разводзьдзем Прыпяці ён папляве ў невядомым напрамку. Сотні тысяч р. дзяржаўных грошай будуць пушчаны на вецер.

Органы РСІ ў тэрміновым парадку павінны заняцца высьвятленьнем гэтай справы.

К.

### „Усё ў парадку"

АСІПОВІЧЫ. (Наш кар.). На Зборскім сельсавеце не праводзіцца ніякай работы па загатоўках і вывазцы лесу. Да 10-га лютага ня былі даны цьвёрдыя заданьні кулакам і заможнікам. Старшыня сельсавету на пытаньне ўпаўнаважанага па лесазагатоўках, як стаіць справа, спакойна адказаў: «усё працуюць, усё ў парадку». Але старшыня ўвёў упаўнаважанага ў абман.

Калі ўпаўнаважаны стаў правяраць становішча загатовак, дык выявілася, што па вёсках кулакі і заможнікі выкручваюцца ад павіннасьці: за два месяцы яны вывезьлі толькі на 15 куб. лесаматар'ялу. Сельсавет нікога не аштрафаваў, рэпрэсіўныя меры пагул ня ўжыты. У самы гарачы час старшыня сельсавету бяз ведама РНК адмаўляў рад вёсак ад лесгамгасу і прымаўляў іх да «лесгскома».

ЛІПЕНЬ.

### Бязьдзейнасьць, якая мяжуе са шкодніцтвам

СЛУЦАК. (Наш кар.). Ня гледзячы на рад прапаноў раённых арганізацый, старшыня Дарасінскага сельсавету **Зіневіч** праяўляе поўную бязьдзейнасьць у справе лесазагатовак. Яго адносіны да кампаніі мяжуюць з сапраўдным шкодніцтвам на лесазагатоўчым фронце.

87 гаспадарак павінны былі атрымаць цьвёрдыя заданьні на вывазцы. Заданьне даведзена толькі да 18 гаспадарак, а іншыя гаспадаркі з-за пазбаўленьня мясцовых арганізацый сядзяць спакойна на сваіх печах і ня думаюць выяжджаць. Сельсавет, выпісваючы нарады на вывазку, зусім ня цікавіцца тым, як яны выконваюцца. У выніку праграма вывазкі выканана толькі на 5 проц. у тон час, калі прайшоў ударны месячнік, застаўся ня больш 2-3 тыдняў да адліту.

Слуцкі РВК павінен зараз-жа зацікавіцца работай старшыні Дарасінскага сельсавету.

Лесавік.

## Аб лёсе аднаго заводу

### НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ ЗГОРТВАНЬНЯ „ЎДАРНІКА"

Навружанай дзесяцігадовай работай зьбіралася і кваліфікавалася рабочая сіла: спэцыялісты, сьпесары, вагаўшчыкі. У 1921 годзе на заводзе «Энэргія» арганізавалася вагавая рамонтная майстэрня, паступова рэарганізаваная ў вагавы цэх. У 1930 г., узмацняючы вялізарнейшае значэньне вагавой вытвэрчасьці ў Беларусі, ВСНГ і Белмэталяаб'яднаньне рэарганізавалі вагавы цэх заводу «Энэргія» ў САМАСТОЯЧНЫ ВАГАВЫ ЗАВОД «ЎДАРНІК» з вытворчай гадовай праграмай на 1931 г. у наступных лічбах: стаповай вагі 24.000 шт., дзесяцічных—18.000 шт., вагі «Фалько»—3.500 шт. (якія, да рэчы сказаць, зьяўляюцца зусім новым відам вытворства і маюць вялікую будучыню ва ўжываньні па сваёй канструкцыі) і вазовыя вагі—120 штук. Завод па сваіх вытворчых магчымасьцях мог-бы без асаблівай напружанасьці выканаць і перавыканаць гэтыя лічбы. Ва ўдарным квартале, пры нездавальняючым забясьпячэньні з боку Белмэталяаб'яднаньня, завод выканаў прамфінплян на 96,8 проц.

Але невядома па якіх прычынах на прэзыдыуме ВСНГ у сакавіку выносяць рашэньне аб перадачы заводу «Ударнік» пад фабзавуч і прапануюць Белмэталяаб'яднаньню падшукаць памяшканьне для заводу на менскіх мэталязаводах. Пытаньне падрыхтоўкі кадраў для мэталяпрамысловасьці, зразумела, зараз, у пэрыяд разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, набывае асабліва важнае значэньне, але з гэтай прычыны цельга растрачваць наяўную кваліфікаваную сілу і ліквідаваць завод, аб важнасьці якога ня прыходзіцца гаварыць у сувязі з усё ўзрастаючай капелтывізацыяй, з павялічэньнем патрэбнасьці ў вагах у аграмаджаньнем сэктары, не гаворачы ўжо аб дзесятках тысяч руб., укладзеных у капітальнае абсталяваньне заводу.

Мы лічым згортваньне і закрыцьцё заводу зусім намэтазгодным, што ідзе наперакор генэральнай лініі партыі, супярэчыць усім пастановам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Пытаньне патрабуе неадкладнага вырашэньня, бо хутка прыходзяць рабочыя з адпачынку, а таксама пачало паступаць на завод жалеза.

АЗЕРСКІ.

АД РЭДАКЦЫІ: Чакаем тэрміновага адказу ад ВСНГБ.

### Раённы зьезд калгасаў

ЛЕПЕЛЬ. (Наш кар.). Закрыўся другі раённы зьезд калгасаў Лепельшчыны. На зьезьдзе прысутнічала ніак 300 делегатаў ад 57 калгасаў, а іх—80 жаночых.

У гаварэны прэзыдыум пад бурныя воплескі былі выбраны члены Палітбюро ЦК УсеКП(б), т. т. **Гей, Гападзед, Чарвякоў і Якаўлеў.**

Зьезд заслухаў справаздачу райкалгасасаюзу, даклады аб арганізацыі поспаха прыліву ў калгасы, аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, аб мерапрыемствах на разьвіцьці жывёлагадоўлі і аб каптраванні яравых пасеваў. Зьезд абгаворваў на ўмовах разгорнутай самакрытыкі работы калгасных арганізацый. У спрэчках на даклад райкалгасасаюзу выступіла звыш 30 чалавек. Зьезд прызнаў незадавальняючай работу райкалгасасаюзу, які мала што зрабіў, каб арганізаваць новы прыліў, каб арганізаваць работу ў калгасах.

## МЕНСК

### Лыжны прабег Урэччы-Масква

Конна-лыжная каманда №-скіх арт. палкоў зрабіла прабег па маршруце Урэчча—Масква. У Маскву каманда прыбыла сваячасова.

Каманда была прынята намесьнікамі наркамваенмора т. т. **Гамарнікам і Каменевым,** якім былі перададзены рапарты і прывітаньні **Рэвваенсавету СССР і тав. Варашылаву** ад Рагачоўскага зьезду саветаў, Нова-Дароскага і Ракцянскага сельсаветаў і калгасаў, прапойскіх партыйнай і прафесыянальнай арганізацый і інш.

Каманда расказала членам Рэвваенсавету і брацкім чырвонаармейскім палкам аб гіганцкім росьце сацыялістычнага будаўніцтва ў гарадох і вёсках БССР, аб клопатах і ўвазе працоўных Савецкай Беларусі да Чырвонай арміі і г. д.

Каманда таксама перадала Рэвваенсавету сродкі, сабраныя працоўнымі БССР на дырыжабль «Клім Варашылаў».

### 100 камсамольцаў ашчадапарат

**У сувязі з разгортваньнем ашчадсправы і значным пашырэньнем нізавой сеткі ашчадкас і, надаючы вялікае значэньне падрыхтоўцы кадраў па сыстэме ашчадкас, у выкананьне адпаведных пастаноў партыі і савецкай улады па гэтым пытаньні, а таксама ў мэтах ажыцьцяўленьня сац. умовы, заключанай ЦК ЛКСМБ З ЦК ЛКСМ Украіны па ўзмацненьні ашчадапарату і ашчадсправы. Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР супольна з ЦК ЛКСМБ арганізавала ў м. Койданаве 4-месячныя курсы па падрыхтоўцы нізавых работнікаў па ашчадсправе. Курсы маюць мэтай падрыхтоўку 70 кантралёраў нізавых ашчадкас і 30 бухгальтароў райкас, і ўкамплектоўваюцца выключна камсамольцамі, камандыруемымі адпаведнымі РК ЛКСМБ, згодна разьвёрстцы ЦК ЛКСМБ. Задача перад курсантамі сур'ёзная і адказная.**

**Толькі пры дапамозе грамадзкіх арганізацый у працы курсаў можна мець найлепшыя вынікі ў сэнсе выпуску добра падрыхтаваных працаўнікоў па ашчадсправе.**

### Прэміяваньне калгасаў, якія датэрмінова выканаюць заданьні па жывёлазагатоўках

Наркамгандлю БССР вылучыў спэцыяльны фонд для прэміяваньня калгасаў, якія датэрмінова выканаюць свае заданьні на жывёлазагатоўках і камплектаваньні стада.

Фонд складаецца з 50 кароў, 15 быкоў, 100 сьвінаматак палешшаных парод, мануфактуры на 100 тыс. рублёў, 9 радыё-установак, 5 тэлефонных апаратаў і 15 барометраў.

Для прызначэньня прэмій створана журы з прадстаўнікоў Белмяса, Белжывсаюзу, Белкаапсаюзу і Калгасцэнтру.

### Выканаць пляны загатовак шчэціны і конволасу

Праграма бальшавіцкага наступленьня трэцяга году пяцігодкі ставіць задачу дабіцца рашаючай пераломі ва ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва.

Шчаціна-шчотачная — воласаапрацоўчая прамысловасьць адыгрывае вялізарнейшую ролю ў разьвіцьці народнай гаспадаркі БССР.

Яна забясьпечвае суднабудаўніцтва, аўтабудаўніцтва і іншыя галіны прамысловасьці неабходнымі інструмантамі і поўфабрыкатным сырцом (пэндзлі, тэхнічныя шчоткі, валасяная тканіна, кручаны волас). Яна абслугоўвае шырокія запатрабаваньні працоўнага насельніцтва.

Роля і значэньне шчаціна-шчотачнай — воласаапрацоўчай прамысловасьці павялічваецца галоўным чынам тым, што значная частка яе прадукцыі экспартуецца, у выніку гэта дае вялікія сродкі для індустрыялізацыі краіны.

Адсюль зразумела, якое вялікае палітычна-гаспадарчае значэньне мае своячасовае і стопроцантнае выкананьне вызначаных планаў загатовак шчаціны і конволасу.

Між тым да гэтага часу дырэктывы партыі і ўраду аб абавязковым выкананьні планаў загатовак другарадных відаў сырцу, сярод якіх першае месца займае шчаціна і конволас, а боку раённых і ў першую чаргу загатоўчых арганізацый яўнай увагі і праламленьня не атрымалі, а месцамі нават упарта на выконваюцца.

Калі заданьне асобнага кварталу на загатоўках воласу выканана на 72,5%, дык на шчаціне дапушчан вялікі прарыў. Замест 27 тон загатоўлена 7 тон, што складае 26 проц. плянавага заданьня.

Такое зіззрнае выкананьне заданьня, асабліва па шчаціне, пагражае зрывам прамфінпляну, экспартнага пляну і пратстоем на фабрыках.

Гэта патрабуе ад партыйных арганізацый у першую чаргу мабілізацыі ўсіх сіл для таго, каб арабіць рашучы пералом у рабоце на загатоўках шчаціны і конволасу.

Вакол гэтай палітычна-гаспадарчай кампаніі не мабілізавана грамадзкая думка адатчыкаў. Варацьба з кулацкай агітацыяй аб псаваньні каштоўных відаў прамысловага сырцу (асмальваньне, хаваньне шчаціны ў сырым месцы, дзе яна псуецца; закопваньне ў зямлю і г. д.) праводзіцца надзвычай слаба. Некаторыя сьвінаводсаюзы і калгасы, якія павінны весьці бязьлітасную барацьбу з кулацкай агітацыяй, самі прававодзяць асмальваньне шчаціны.

Загатоўчыя арганізацыі зьнізу да верху недаацэньваюць усёй палітычнай важнасьці правядзеньня гэтай кампаніі. Замест рашучых мер па ўзмацненьні загатовак, яны пакляліся на апартуністычную стаўку самацёку, лічачы гэту работу апошняй чаргі.

Асабліва агідныя адносіны да гэтага важнейшага вучастку работы назіраюцца з боку Белмяса і Саюзскуры. Гэтыя арганізацыі замест бальшавіцкай работы па выкананьні плянаў загатовак, займаюцца пустымі гутаркамі, абяцаньнямі, «падрыхтоўваюцца», а шчаціна тым часам прападае.

Апарат Белпушнчаціны ня стаў яшчэ баявым штабам у правядзеньні ўсёй гэтай работы.

Загатоўчы перыяд у разгары. Шчаціна і конволас ёсьць. Толькі права-апартуністычная недаацэнка палітычна-гаспадарчага значэньня гэтай кампаніі і няўменьне загатоўчых арганізацый ідзе і стаіць на чале гэтай работы прыязлі да ганебнага прарыву.

Задача партыйнай арганізацыі — мабілізаваць масы калгасьнікаў, бедняцтва і серадняку на шпарчайшае выкананьне плянаў загатовак шчаціны і конволасу.

Трэба нанесьці руйнуючы ўдар по кулацкай агітацыі і права-апартуністкай недаацэнцы гэтай важнейшай работы.

Дырэктар Белшчаціны БЛЮМКІН.

### *Да 60-ай гадавіны Парыскай камуны*

ЦК МОПР'у БССР разаслаў дырэктыўны ліст аб правядзеньні 60-годзьдзя Парыскай Камуны. Усе ячэйкі МОПР'у зараз-жа павінны абгаварыць гэта пытаньне сумесна з партыйнымі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі.

Ячэйкі павінны склясьці пляны сьвяткаваньня і выпучыць камісію для ажыцьцяўленьня гэтых плянаў. На прадпрыемствах павінна быць праведзена кампанія вярбоўкі рабочых-мопраўцаў ва ўдарныя брыгады імя 60-годзьдзя Парыскай Камуны.

З 10-га па 20-га сакавіка праводзіцца ў БССР дэкада ліквідацыі запазычанасьці па членскіх узносах у МОПР. Ва ўсіх ячэйках будуць створаны тройкі для масавай вярбоўкі рабочых, калгасьнікаў і саўгасьнікаў у рады МОПР'у.

У школах, дзіцячых дамох і пляцоўках будуць праведзены з дзецьмі гутаркі аб Парыскай Камуне, а таксама аб задачах і дзейнасьці МОПР'у.

17 і 18-га сакавіка ўсе гаркомы і райкомы МОПР'у арганізуюць масавыя, інтэрнацыянальныя ўрачыстыя вечары, прысьвечаныя 60-годзьдзю Парыскай Камуны і дню МОПР'у.

На сходах будуць зачытаны лісты ад палітзьключоных, а таксама адказы на гэтыя лісты.

Да дня 18-га сакавіка гарадзкія арганізацыі МОПР'у арганізуюць выезды мопраўскіх брыгад у падшэфныя калгасы і саўгасы.

### 80 тыс. рублёў—у фонд зімовай дапамогі барацьбітом рэвалюцыі

1-га сакавіка скончылася кампанія зімовай дапамогі палітзьняволеным капіталістычных турмаў і іх сем'ям. Кантрольная лічба па БССР выканана на 106 проц.—замест 75 тыс. руб. сабрана 80 тыс.

### Арганізацыя дзяржаўных унівэрмагаў

**Нарада пры Наркамснабе прыняла пастанову аб арганізацыі ў БССР сеткі крам дзяржаўнага раздробнага гандлю. У першую чаргу такія магазыны адкрыюцца ў Менску — прадуктовыя і прамтаварныя, у Віцебску і Гомелі — прамтаварныя.**

**Гэтымі кіраўніцтва гэтымі магазынамі пры Наркамснабе ствараецца спэцыяльнае аб'яднаньне — Беларускае дзяржаўнае аб'яднаньне раздробных унівэрсальных магазынаў.**

**Прызнана мэтазгодным у асноўным праводзіць продаж прадуктаў і тавараў па павышанных цэнах і вызваліць дзяржаўныя раздробныя магазыны ад функцый плянавага забясьпячэньня.**

### 1-ы зьезд рабочых кераміча-цэмэнтнай прамысловасьці

8-га сакавіка адкрыўся першы ўсебеларускі зьезд саюзу рабочых кэрамічна-цэмэнтнай прамысловасьці.

На зьезьдзе прымуць удзел 42 делегаты з усіх раёнаў БССР. Апрача таго прысутнічае звыш 100 мясцовых рабочых.

У парадку дня зьезду: даклад т. САБАЛЕЎСКАГА аб далейшых задачах саюзу ў сувязі з пастановамі V пленуму УсеЦСПС; даклад ВСНГБ і суседаклад Будаб'яднаньня аб становішчы і перспэктывах разьвіцьця кэрамічна-цэмэнтнай прамысловасьці.

На першым пасяджэньні былі заслуханы прывітаньні прадстаўніка ЦК саюзу будаўнікоў, Мінскага палка, студэнтаў Беларускага політэхнікуму і г. д.

У спрэчках па першым дакладзе была завострана увага вакол пытаньняў выкананьня прамфінпляну, сацыябаронніцтва і ўдарництва на прадпрыемствах кэрамічна-цэмэнтнай прамысловасьці.

### *Шлюзаваньне ракі Сож*

Прэзыдыум дзяржпляну БССР зацьвердзіў эскізны праект шлюзаваньня ракі Сож (Сожбуд).

Праект прадугледжвае шлюзаваньне ракі ад вёскі СТАЙКІ да гор. КРЫЧАВА (адлегласьць 91 клм.). Гэта дасьць магчымасьць транспартаваць па Сожы фасфарытную руду, крэйду, кераміччную гліну і інш. выкапні ад месца іх здабычы (в. Стайкі і Бахраўкі) да месца пераапрацоўкі (Крычаў), а таксама абслугоўваць транспартам Мсьціслаўскі раён.

Асноўныя аб'екты будаўніцтва—дрыўляныя гаці і 6 шлюзаў.

Будаўніцтва будзе каштаваць 3.370 тыс. руб. РАБОТЫ ПАЧНУЦЦА У ГЭТЫМ ГОДЗЕ. Да 1 мая 1931 году павінна быць пабудавана тэлефонная сетка, баракі і інш. будынкі. Усе работы па Сожбудзе павінны быць скончаны да пачатку навігацыі 1932 году.

Праект шлюзаваньня р. Сож унесены на зацьвярджэньне ў СНК БССР.

### Новы парадак выплаты пачасовай непрацаздольнасьці

Страхнаса, у адпаведнасьці з пастановамі апошняга пленуму УсеЦСПС, уводзіць новы парадак выплаты па часовай непрацаздольнасьці. Асобы, якія прапрацавалі да 3-х год на прадпрыемстве, або ва ўстанове і ня менш 2-х год у адным месцы, атрымліваюць аплату па часовай непрацаздольнасьці ў разьмеры $^4/_5$ свайго заработку за першыя 20 дзён хваробы. Прапрацаваўшыя да 2-х год атрымліваюць $^4/_5$ зарплаты за першыя 20 дзён, да 1 году — 50 проц. заработку.

Ня члены прафсаюзаў атрымліваюць за ўвесь час хваробы толькі 50 проц. зарплаты.

### Раўняйцеся па калгасах імя М. Горкага і „Гэрой працы"

ВЯГОМЛЬ. (Брыгада «Зьвязды»). Калгас імя Максіма Горкага і «Гэрой працы» перавыканалі гадавое заданьне на ільне: першы выканаў плян на 197 проц., а другі—на 178.

Ганебна адстаюць калгасы «Чырвонал Вярэсіна», «Чырвоны пагранічнік», «Колас», «Культурны шлях», «Чырвоная зорка» і імя Вярэсіна, якія яшчэ не здалі ніводнага кілі ільну. Райкалгасаюз ніякіх захадаў да спагнаньня ільну з котых калгасаў ня прымае. Не папулярызаваны таксама альготы здатчыкам ільну і аб праміраваньні ніякіх прамтаварамі. Цар'ячэйкі калгасаў і сельсаветы таксама бязьдзейнічаюць.

Брыгадзір Волат.

### На пабудову дырыжабля „Клім Варашылаў"

Капаткевіцкі дэлегацкі пункт у дасьпе 8-га сакавіка арганізаваў збор сродкаў на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў». За адзін толькі дзень сабрана 50 руб.

### Паведамленьні

— **Дом Камасьветы.** У 19 з пал. гадз. — даклад т. Ютава «Расійскі меншавізм на службе міжнароднай буржуазіі» (да 10-годзьдзя Лондонскага кангрэсу). Пасьля дакладу — мастацкая частка.

— **ЦК МОПР'у.** У 19 гадз. — пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР.

— **Дом Пісьменьніка.** У 19 гадз. — агульны прафсаюзны сход МК пісьменьнікаў.

— **Пушкінская біб-ка.** У 20 гадз., у пам. Вярэсьпенскага пардому (Краснаармейская, 16) — працяг бібліятэчнага савету Пушкінскай біб-кі.

— 12 сакавіка, у 19 гадз., у пам. клюбу саўгандальслужачых склікаецца пленум гарадзкога савету Асаавіяхіму сумесна з актывам. У парадку дня: 1) Вынікі 2-га зьезду Асаавіяхіму; 2) Бягучыя справы. Яўка членаў гарсавету, сакратароў ячэек з усім складам бюро абавязкова.

— **Менгарком КП(б)Б.** У 18 гадз., у пам. вялікай залі гаркому выклікаюцца на нараду па якасьці прадукцыі: 1) Вытворчыя сэктары, сакратары цэх. ячэек, цэх камітэтаў і камуністы-рацыяналізатары прадпрыемстваў: «Энэргія», «Камунар», «Ударнік», «Вальшавік», абутк. ф-ка, «Акцябр», «Бежаруска», нікозавод, хлебазавод; 2) Партчысткі кіраўніцтва: Белмэталяаб'яднаньня, Белшвейаб'яднаньня, Скураб'яднаньня, Хімаб'яднаньня, Піклоаб'яднаньня; 3) Партчысткі рацыяналізатарскага бюро ВСНГ і навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці пры ВСНГБ; 4) Прадстаўнікі рэдакцыі цэнтральных газэт, рэдакцый пасьведчаньняў прадпрыемстваў (партыцыны).

— **Культпроп Менгаркому КП(б)Б** у 16 гадз. склікае нараду, на якую павінны зьявіцца ў абавязковым парадку т.т. Мсьевіч (наргас), Марэнаў, Крываносаў (хімінстытут), Каштанаў, Ірысмакаў (саўбуд), Вайнер, Далідовіч (наргас), Пісьман (падфак), Літвінаў, Зевін (мэдінстытут), Гуліла (будінстытут).

### Папраўка

У перадавым артыкуле «Зьвязды», № 66, ад 9 сакавіка г. г., перабыты пераносны абзац. Трэба чытаць так: «З мэтай апублікаваньня адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб рабоце чыгуначнага транспарту прайшло ўжо каля двух месяцаў. Рэалізацыя адозвы, дадзенай разгорнутую практычную праграму барацьбы за ўмацаваньне транспарту, павінна была ўжо забясьпечыць рад канкрэтных результатаў і дасягненьняў. Часу прайшло даволі» і г. д.

Адказны рэдактар С. БУД[illegible]ЧЫ.


Сёньня, 11 сакавіка адкрыты сэзон. Беларускі другі дзяржаўны тэатр Е. Кіршон. РЭЙКІ ГУДУЦЬ. Пьеса ў 5 дзеях, 12 абразох. Пач. а 8 гадз.

Кіно-тэатр „Культура". Фільм з эпохі грамадзянскай вайны АПАЙКА. Звыш праграм. ЗА УСЕНЯВУЧ у 1 ч. Пачатак 7 г., 8 г. 45 м., і 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". На тым баку. драма ў 7 частках. кіно-хроніка Совкінно № 4. Пачат. 7 г., 8 г. 45 м., і 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал". ГАМБУРГ драма ў 8 частках з пралёгам. Пачатак 1-га сэансу ў 6 г. 30 м. Каса—з 4 з пал. гадз.

КІНО „Гігантары". МОНШ БЭНКС у лепш. замедн. кам. Падкова шчасьця ў 6 част. Пач.—у 6 г., 7 г. 30 м., 9 і 10 г. 30 м. Каса адкрыта—з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр". 1) Джэнтльмэн і певень. Другі дзіцячы камедыя ў 6 частках. 2) Бунт субоў. Культурфільм ў 2 частках. Пач. сэансу ў 1 г. дня. Каса—з 12 г.

КІНО „СПАРТАК". ІГАР ІЛЬІНСКІ ў карціне КАЛІ ПРАБУДЖАЮЦЦА МЕРТВЫЯ. комедыя ў 7 частках. Пач.: з 7 г., 8 г. 45 м. 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

БРАГІНСКІ ТЭХНІКУМ буйной жывёлагадоўлі і малочнай гаспадарці. АБВЯШЧАЕ ВЕСНАВЫ НАБОР на першы курс тэхнікуму і на аддзяленьні: буйной жывёлагадоўлі—60 асоб, малочнай гаспадарці—35 асоб. ЗАЯВЫ падаюць на адрасе: м. Брагін (Гомельшчына) Малочна-жывёлагадоўчы тэхнікум ДА 20 САКАВІКА 1931 г. з прыкладаньнем усіх дакумантаў, згодна даведніка НКП за 1930-31 г. З 20 па 25 сакавіка праводзяцца іспыты асобам, якія ня скончылі семігодку. Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатамі і стыпэндыяй, як і іншыя тэхнікумы. Заняткі пачнуцца з 1 красавіка 1931 г., ас чым залічэньне будзе пакідзена пэрсанальна. Тэхнікум выхтуе аграномаў-жывёлаводаў і аграномаў-маланаведаў. Дырэктар тэхнікуму Сяводзька.

Аршанскі тэхналёгічны мясапрамысловы тэхнікум АБВЯШЧАЕ 2-гі НАБОР СТУДЭНТАЎ ТЭХНІКУМУ. Грамадзяне асобы, якія скончылі 7-мігодкі, школу рабочай моладзі, школу сялянскай моладзі і курсы падрыхтоўцы ў тэхнікум. Заявы прымаюцца ў канцылярыі тэхнікуму ў гор. Горны. Да заявы патрэбна прадаць наступныя дакумэнты: даведку аб сацыяльным і матар'яльным станавішчы, для сялян аб падатку па 31 г. і выбарчых правах, аб адукацыі, аб узросьце, аб становішчы здароўя і анкету вераную адпаведнымі ўстановамі. Студэнты будуць забясьпечаны інтэрнатам і стыпэндыяй, згодна пастановы СНК. Прыём заяў праводзіцца да 20 сакавіка. «БЕЛМЯСА».

ВЫДАВЕЦТВА ЦК УсеКП(б) „ПРАВДА". ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1931 год на штомесячную філёзофскую і грамадзка-эканамічную часопісь „ПОД ЗНАМЕНЕМ МАРКСИЗМА". Часопісь выходзіць пад рэдакцыяй: Пакроўскага М. Н., Адарацкага В. В., Міціна М. В., Кольмана Э., Юдзіна П., Максімава А. А., Дэборына А. М., Ціміразева А. К. Часопісь «Под знаменем марксизма»—органы орган марксизму-ленінізму, вядзе рашучую барацьбу за генэральную лінію партыі, супроць усякіх адхіленьняў ад ле. праводзячы наступова ва ўсёй сваёй рабоце ленінскі прынцып партыйнасьці філёзофіі. У галіне філёзофіі часопісь «Под знаменем марксизма» будзе весьці няўхільную барацьбу на дзі фронты: з механістычнай разьвіцьцём марксизму, як галоўнай небясьпекай сучасьнага пэрыяду, а таксама з ідэалістычнымі скажэньнямі марксизму-ленінізму т. т. Дэборына, Карева, Стэна і інш. Важнейшай задачай часопісі «Под знаменем марксизма» зьяўляецца сапраўдзе выкананьне вызначанай для яе Леніным праграмы, распрацоўка ленінскага этапу разьвіцьця дыялектычнага матэрыялізму, бязьлітасная крытыка ўсіх антымаркісцкіх і, значыцца, антыленінскіх ухілаў у філёзофіі, грамадзкіх і прыродазнаўчых навуках, як-бы ні ны не маскаваліся. Часопісь «Под знаменем марксизма» распрацоўвае тэорыю матэрыялістычнай дыялектыкі, пытаньні гістарычнага матэрыялізму у цесным сувязі з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва і сусьветнай рэвалюцыі. Часопісь «Под знаменем марксизма» ідзе да выкананьня гэтых задач шляхіцкіх матэрыялістаў-дыялектыкаў, сістэматычна выхоўваючы бальшавіцка-кітрыманыя філёзофскія кадры. «Под знаменем марксизма» разьлічана на актыўных работнікаў партыі, вастаўнікаў і слухачоў камузаў, ВНУ, рабфакаў, марксыцкіх гурткоў, таварышоў, якія займаюцца самаадукацыяй і г. д. ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на 1 мес.—1 р. 50 к., на 3 мес.—4 р. 25 к., на 6 мес.—8 р., на 12 мес.—15 р. Цана асобнага нумару—1 руб. 50 коп. ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА на пошце, лістаносцамі і ўпаўнаважанымі па партыйнай лініі ў ячэйках УсеКП(б).

„ЗА ПОЛИТЕХНИЧЕСК